

ІВАН ЭЙСМАНТ ПРА САКРЭТЫ ТЭЛЕВІЗІЙНАЙ КУХНІ

4

ПАСАЖЫРЫ ЦЯГНІКА ПАМЯЦІ АБ ПАДАРОЖЖЫ



МС


Выдаецца з 9 жніўня 1917г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 ЧЭРВЕНЯ 2022 г.
СЕРАДА
№ 120 (29742)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ШВЕД, Генеральны пракурор:**

*«Час расстаўляе ўсё на свае месцы, і падзеі жніўня 2020 года праз прызму гістарычнай памяці бачацца сёння больш выразна і зразумела. Рашэнне аб узбуджэнні крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа, лічу, было своечасовым, абсалютна правільным. Вынікі расследавання справы гавораць самі за сябе. Мы ўскалыхнулі памяць людзей, а гэта вельмі важна. Тыя, хто не памятае сваю гісторыю, не памятае сваёй роднасці, на жаль, гэтыя народы асуджаныя. Трагічныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага перыяду — адзін са стрыжняў, на якім будуецца і будзе будавацца ідэалогія, разуменне сутнасці нацыі беларусаў, сутнасці нашай гістарычнай справядлівасці і разумення ролі Беларусі ў гісторыі і геапалітыцы ў цэлым».*

## НАШ ГОЛАС У АБАРОНУ ГІСТАРЫЧНАЙ ПРАЎДЫ І СПРАВЯДЛІВАСЦІ

Паважаныя суайчыннікі!

Сёння мы ўспамінаем журботную дату. Восемдзясят адзін год таму цёплая, сонечная нядзельная раніца 22 чэрвеня для мільёнаў савецкіх грамадзян у адно імгненне абярнулася жахамі бамбёжак, бязлітасным знішчэннем мірных жыхароў і бясконцым болем. Размах фашысцкага тэрору быў такі, што мы да гэтага часу не ведаем дакладнай колькасці страт.

Больш як год Генеральная пракуратура расследуе справу аб генацыдзе беларускага народа, выкрываючы ўсё новыя і новыя месцы масавых пахаванняў людзей — расстраляных, павешаных, спаленых жывымі.

Многім на Захадзе хацелася б забыцца пра зверствы, якія чынілі іх бацькі і дзяды на нашай зямлі. Яны ўжо перапісалі гісторыю вайны ў сваіх падручніках, аддалі забыццю вялікі подзвіг савецкага салдата, які крывёй заплаціў за свабоду і жыццё народаў Еўропы. Цяпер замахнуліся на нашу гістарычную памяць.

Але мы ведаем: набат праўды праб'ецца скрозь сцяну маўчання і хлусні. Злачынствам нацыстаў на беларускай зямлі будзе дадзена належная прававая ацэнка, а вынікі расследавання — прадстаўлены сусветнай супольнасці.

Беларусь памятае ўсіх герояў і бязвінных ахвяр той вайны. Памятае яна і імёны тых, хто супрацоўнічаў з ваеннымі злачынцамі і ўдзельнічаў у крывавых расправах з насельніцтвам.

Мы зробім усё, каб нашы дзеці і ўнукі захоўвалі гэтую памяць як залог адзінства нацыі і мірнай будучыні дзяржавы.

У Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа мы, беларусы, схіляем галовы перад свяшчэнным подзвігам пераможцаў, якія вызвалілі свет ад нацызму, і ўзвышаем свой голас у абарону гістарычнай праўды і справядлівасці.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# НА БАБІНАВІЦКІХ ВЫШЫНЯХ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вайна ў вёсцы Бабінавічы Лёзненскага раёна пакінула цяжкі і крывавы след. Жывая памяць пра тыя апаленыя дні і сёння жыве ў сэрцах пакалення, народжанага ў перадваенныя і ваенны час. Засталіся толькі адзінкі з тых вясковых жыхароў, чыё дзяцінства прыпала на ліхалецце саракавых. Яны добра памятаюць, як ад вялікага населенага пункта засталося толькі чатыры хаты, як Бабінавічы сталі рубяжом фронту на цэлых дзевяць месяцаў. А яшчэ памяць жыве ў невялікім вясковым музеі баявой славы — першым музеі ў раёне, дзе сабраны важныя артэфакты і дакументы. Памяць захоўвае і брацкая магіла, якая знаходзіцца на высокім пагорку ў цэнтры вёскі — самым буйным мемарыяльным комплексе Лёзненшчыны. Тут, на плітах воінскага пахавання, якому прысвоены асабісты нумар — 4317, пазначаны прозвішчы дзвюх тысяч сямісот васьмідзесяці аднаго абаронца. Але і да сённяшняга дня ніхто дакладна не ведае, колькі яшчэ салдат спачывае пад гэтым курганам і чакае свайго часу, адкрыцця. Пошукамі тых, хто прапаў без вестак на Бабінавіцкіх вышынях, займаецца музей, які за ўвесь перыяд свайго існавання вярнуў з небыцця болей за дзве тысячы пяцьсот невядомых імён. Калі кіраўніком музея стала Дзіна БАГДАНОВІЧ *(яна на гэтым фота)*, на новых плітах з'явіліся прозвішчы яшчэ адной тысячы ста дзевяноста пяці чырвонаармейцаў радавога і афіцэрскага складу, а таксама партызан. Пошукі працягваюцца і да сёння. Дзіна Анатольеўна часта падымаецца на курган, каб зверыць архіўныя даныя са спісам на мемарыяльных дошках, пагладзець на стан помніка, навесці парадак каля абеліскаў.

СТАР. 13

## КОРАТКА

- **По даручэнні Прэзідэнта медыкам павысяць заробак: з 1 ліпеня з'явіцца новая надбаўка.**
- Праваахоўнікі: пачасціліся выпадкі лжывых паведамленняў ад «службы бяспекі Telegram».
- **Палёт беларускага касманаўта на МКС запланаваны на восень 2023 года.**
- Рэпазіторый БДУ заняў другое месца ў сусветным рэйтынгу ўніверсітэцкіх бібліятэк.
- **МНС прадставіць новую лінейку пажарных аўто на выставе індустрыі бяспекі ў Мінску.**

ISSN 1990 — 763X

22120
9 771990 763008

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

З першых вуснаў

# «ДЛЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ НАСТАЎ ЗАЛАТЫ ВЕК»

## Прэзідэнт настройвае на стваральную і адказную працу

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ў Аршанскім раёне Віцебскай вобласці наведаў ААТ «Агракамбінат «Юбілейны». Гаспадарка перадавая і ўзорная. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, у такія трэба прыязджаць, каб проста паглядзець і адпачыць. Прадпрыемства ўтварылася ў выніку аб'яднання шэрагу больш дробных гаспадарак, што дало магчымасць сканцэнтраваць вытворчыя сілы і кармавую базу. Аляксандр Лукашэнка цікавіўся шэрагам аспектаў у рабоце агракамбіната, у тым ліку пытаннямі забяспечанасці тэхнікай.**

Ужо ў маштабе краіны абмяркоўваўся ход нарыхтоўкі травяністых кармоў. Аб гэтым далажыў кіраўнік Мінсельгасхарча Ігар Брыло. Рэгіёны вытрымліваюць раней складзены план, сітуацыя развіваецца пазітыўна. Асобнае пытанне — нарыхтоўка ў палімерную плёнку. Частка матэрыялу закуплялася па імпарце, ёсць і беларускія аналагі, але іх кошт таксама дастаткова высокі. І тут жорсткае патрабаванне Прэзідэнта, у тым ліку ў разрэзе імпартазамяшчэння. «На жорсткі кантроль ураду, каб гэта плёнка была на працягу года. Гэта перспектыўная тэхналогія, — даручыў Прэзідэнт. — Плёнка павінна быць. І гэта тэхналогія павінна быць таннай, даступнай і для слабых гаспадарак. Калі будзе танны гэты працэс, ніхто не спатрэбіцца ўгаворваць».

Аляксандр Лукашэнка спытаўся і пра тое, як міністр ацэньвае развіццё Віцебшчыны ў пытанні АПК. «Мне патрэбны вынік. Парадак тут павінен быць. Патрэбна дысцыпліна. Будзе дысцыпліна — праблем не будзе», — падкрэсліў ён, адзначыўшы, што гэта пытанне па вобласці павінна быць на асаблівым кантролі ў міністра.

Кіраўнік дзяржавы ў агракамбінаце азнаёміўся з работай малочнатаварнага комплексу «Купалінка». Тут ён звярнуў увагу на яшчэ адно важнае пытанне, якое патрабуе ўвагі ў АПК, — захаванасць жывёлы. «За падзеж жывёлы адкажаце галавой», — папярэдзіў беларускі лідар.

У час наведвання кіраўніка дзяржавы абмяркоўваліся і праблемныя пытанні ў рэгіянальным разрэзе. Адно з іх — меліярацыя. Аляксандр Лукашэнка даў канкрэтныя ўказанні наконт гэтага, даручыўшы вызначыць схему фінансавання і аб'ёмы работ.

Прэзідэнт таксама закрануў пытанні развіцця сыравінных зон. Ён падкрэсліў, што ў гэтай рабоце нароўні з дзяржаўнымі павінны ўдзельнічаць і прыватныя сельгасарганізацыі. Кіраўнік дзяржавы бачыць перспектыву ў далейшым узбуйненні гаспадарак у АПК: «Мы ўсё роўна будзем ісці да буйных кампаній». Паводле яго слоў, гэтага патрабуюць сучасныя рэаліі — аб'яднаўшацца, далучаць землі. Адначасова Прэзідэнт звярнуў увагу на падрыхтоўку кадраў на базе такіх гаспадарак. «Трэба кадры гадаваць свае», — падкрэсліў ён.

На заканчэнне Аляксандр Лукашэнка ў агракамбінаце наведаў машынны двор, азнаёміўся са станам і абслугоўваннем тэхнікі.

***

**Прэзідэнт таксама паразмаўляў з працоўным калектывам агракамбіната «Юбілейны», адказаў на пытанні вяскоўцаў.**

### «Вы павінны ў гэтыя гады ўзяць свае грошы»

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на неабходнасць скарыстацца добрай кан'юнктурай цэн на прадукты харчавання на сусветным рынку і ў найбліжэйшыя некалькі гадоў паспяхова спрацаваць. «Для сельскай гаспадаркі наступіў залаты век. Сітуацыя зараз складваецца такая, што нам трэба кроў з носу гэты і наступны год спрацаваць добра ў сельскай гаспадарцы. Таму што ваша прадукцыя, асабліва за межамі краіны, каштуе вялікіх грошай. Цэны на прадукты харчавання падскочылі неймаверна. Таму трэба ўмець узяць тое, што мы павінны. Для сельскай гаспадаркі, шчыра кажу, наступіў такі залаты век. Колькі ён працягнецца, ніхто не ведае. Але я перакананы, што гэты і наступны гады будуць нашымі — тых, хто займаецца сельскагаспадарчай вытворчасцю і вырабляе прадукты харчавання, — падкрэсліў беларускі лідар. — Таму, як бы ні было цяжка, вы павінны ў гэтыя гады ўзяць свае грошы. Для таго, каб паправіць матэрыяльнае становішча, недзе з крэдытамі разлічыцца і далей спакойна працаваць».

«Вам яшчэ раз дзякуй за тое, што рызыкнулі працаваць у сельскай гаспадарцы і працуеце. Ведаю, што ўсё складваецца не зусім проста. Але ваша гаспадарка нядрэнная. У вас у руках усё для таго, каб жыць нармальна», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

### «Калі будуць нармальныя ўмовы жыцця і працы, людзі сюды прыйдуць»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што апошнія гады ў сельскай мясцовасці ствараюцца камфортныя ўмовы для жыцця і працы людзей. Прэзідэнт нагадаў, што па яго патрабаванні ў Беларусі атрымалі развіццё аграгарадкі. Іх мэтай якраз і было стварэнне ў вёсцы больш камфортных умоў для жыцця, каб замацаваць людзей у рэгіёнах. Аднак усё гэта не дасць выніку, калі не стварыць працоўныя месцы і належныя ўмовы працы, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. «Але яны будуць нішто, калі не будзе добрай тэхнікі, добрых камплексаў — машыннага двара, збожжатока, калі не будзе добрых умоў працы. У нас, дарэчы, спачатку былі перакос: аграгарадкі стварылі, а тэхналогіі і тэхніка адставалі. А зараз пачынаем падцягваць, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта працэс не хуткі, гаспадарка не адна, а іх тысячы. Але за пяцігодку краіна будзе іншай і ў сельскай гаспадарцы таксама, калі скарыстаемся гэтым момантам, калі прадукты харчавання падаражэлі (па ўсім свеце. — **«Зв.»**)».

«Калі будуць нармальныя ўмовы жыцця (гэта перш за ўсё) і работы, людзі сюды прыйдуць», — адказаў кіраўнік дзяржавы на пытанне, якія меры трэба прыняць для замацавання моладзі ў сельскай мясцовасці.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў свой час, будучы кіраўніком гаспадаркі, сутыкнуўся з праблемай лішку рабочых кадраў, і гэта, на яго думку, горш, чым недахоп. «Мы будзем усё роўна, як і ва ўсім свеце, ісці да таго, што колькасць насельніцтва ў вёсцы залішняй не будзе. Будуць толькі тыя, хто павінен працаваць», — растлумачыў Прэзідэнт.

Калі б Беларусь не захавала такія буйныя формы гаспадаркі, як калгасы і саўгасы, а пайшла па шляху драбнення на фермерскія гаспадаркі, то адток людзей з сельскай мясцовасці быў бы яшчэ большы, упэўнены Прэзідэнт. Аднак у краіне захаваны і тыя, і іншыя формы гаспадарання ў вёсцы, што дае магчымасць аграпрамысловаму комплексу спакойна развівацца. «Дзесьці больш фермераў, дзесьці менш, хтосьці сыходзіць, хтосьці прыходзіць і гэтак далей. Камусьці рэдка, але перадаём стратныя калгасы і саўгасы. Але насельніцтва ўсё роўна будзе скарачацца. Я спрабую ўтрымаць колькасць насельніцтва (на вёсцы. — **«Зв.»**), хоць, калі глядзіш па статыстыцы, у нас значна ў вёсцы насельніцтва скарачаецца. Але яго дастаткова, таму што тэхніка іншая прыходзіць», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

### «Бяром з рэгіёнаў людзей, каб наверх падымаліся»

Прэзідэнт падкрэсліў, што дзяржаўная маладзёжная палітыка ў Беларусі нацэлена на ўсебаковую падтрымку дзяцей як у частцы іх выхавання, навучання, медыцынскай дапамогі, так і адносна мер падтрымкі пры працаўладкаванні ў малых населеных пунктах. «Прычым мы дапамагаем як ні адна дзяржава ў свеце, хоць мы не самая багатая дзяржава. Дапаможам з дзеткамі. Але вы павінны разумець, што дзеці — гэта ваша, вы іх нараджалі і вы павінны перш за ўсё за іх адказваць, а потым — дзяржава», — адзначыў Прэзідэнт.

У Беларусі, паводле яго слоў, укладзены каласальныя грошы ў сферу аховы здароўя, у тым ліку для аказання якаснай дапамогі маці і дзецям. Дарэчы, сітуацыя з каранавірусам пацвердзіла, што краіна выбрала правільны шлях як у развіцці айчыннай медыцыны ў цэлым, так і ў стратэгіі барацьбы з COVID-19.

Дзяржаўная падтрымка аказваецца і сферы адукацыі, асабліва ў частцы забеспячэння навучальнага працэсу для дзяцей з сельскіх раёнаў. «Мы ствараем роўныя ўмовы для ўсіх. Я заўсёды арыентую ВНУ: вы паглядзіце на глыбінку, на рэгіёны, там у дзетак не такія магчымасці, як у Мінску. А мы ВНУ апанавалі мінскімі школьнікамі, і студэнты, як толькі якая завіруха, у першых шэрагах. Таму што яны не ад зямлі, не бачылі гэтага нармальнага жыцця», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што менавіта на кандыдатаў з рэгіёнаў часта робіцца стаўка пры падборы кіруючых кадраў у краіне: «Бяром з рэгіёнаў людзей, каб наверх узнімаліся адсюль: кіравалі краінай, міністрамі былі і гэтак далей».

Ён запэўніў, што дзяржава працягне ствараць умовы для замацавання моладзі ў вёсцы. «Але пажадана, каб і вы былі душой з гэтай зямлёй, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Калі вашы дзеці будуць прывязаны да зямлі, ніякае замацаванне не трэба. Яны прыедуць, атрымаюць адукацыю, спецыяльнасць, прыйдуць да кіраўніка і скажуць: «Я гатовы ўперціся і рабіць у цябе вось гэта, а ты мне дапамажы дом пабудаваць». Кожны кіраўнік заўсёды гэта зробіць. Гэта ваша выхаванне, як вы будзеце выхоўваць вашых дзяцей».

### «Будзем рамантаваць. І асабліва мясцовыя дарогі»

Прэзідэнту задалі пытанне, ці будзе дзяржава ва ўмовах санкцый і ў далейшым падтрымліваць рэканструкцыю мясцовых дарог. «Не проста будзе. Мы павінны ўзмацніцца зараз», — запэўніў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што для гэтага ёсць усе магчымасці. Аснова асфальту — нафтапрадукт — бітум, а для Беларусі нафта ў дадзены момант даступная па кошце ў параўнанні з сусветным узроўнем. Што да бетону для пакрыцця дарожнага палатна, то ў краіне таксама мадэрнізаваны адпаведныя вытворчасці, ёсць неабходныя магутнасці. «Гэта значыць, чаму сёння не будаваць дарогі і не рамантаваць? Нам і будаваць іх не шмат трэба, нам трэба гэтыя ўтрымліваць. Мы прынялі праграму будаўніцтва і мадэрнізацыі мясцовых дарог. Мы не адстаём. Там тысячы кіламетраў дарог. Мадэрнізуем, аднаўляем. І няма ў нас прычыны, каб пад нейкімі санкцыямі згарнуць гэту работу, — заявіў Прэзідэнт. — Будзем рамантаваць. І асабліва мясцовыя дарогі. Ад раённага цэнтра да аграгарадка за пяцігодку ўсе дарогі павінны быць. Двухпалосныя, нам не трэба там аўтабаны, але ў добрым стане. І ад вобласці да ўсіх раёнаў дарогі павінны быць нармальныя».

Гаворачы аб санкцыях, кіраўнік дзяржавы адзначыў запатрабаванасць таго, што выпрацоўваецца ў краіне: «Адзенне, прадукты харчавання, наша тэхніка... Мы не паспяваем выконваць заказы, якія нам паступаюць на прадпрыемствы. Вось і санкцыі... Таму не трэба перажываць. Нас душаць санкцыямі гадоў 20. Ну зараз больш жорсткія санкцыі ўвялі гэтыя мярзотнікі».

### «Галоўнае, каб было каго апранаць у гэтае адзенне»

Пытанне аб ініцыятыве абавязковага нашэння школьнай формы задала адна з работніц прадпрыемства, адзначыўшы, што ў бацькоў узнікае пытанне аб асартыменце, даступнасці і цане. «Чуў аб гэтым. Шырокага распаўсюджвання не атрымала, але абавязкова займуся гэтым пытаннем так, як вы сказалі: даступнасць, цана. Абяцаю, што ніхто там на кішэню працаваць не будзе», — паабяцаў Прэзідэнт.

Ён таксама звярнуў увагу на асартымент: «Павінна быць маса разнастайнасці. Не павінна быць як у савецкія часы — ні налева, ні направа. Так, не павінна быць «разбэшчанасці», як модна казаць, дрэскод. Але не трэба заганяць дзяцей у нейкую вузкую прастору. Гэта разнастайнасць павінна быць дастатковай. Абяцаю гэтым заняцца. І паглядзім па кошце. Я не думаю, што там хтосьці будзе загінаць кошт. Ды гэта і пад кантролем усё. Да 1 верасня мы адрэгулюем гэтае пытанне. Не перажывайце. Галоўнае, каб было каго апранаць у гэтае адзенне».

### «Усе хочуць дадому»

Адказваючы на пытанні работнікаў агракамбіната, Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, на якіх умовах могуць вярнуцца ў Беларусь тыя, хто раней збег з краіны.

«Пабеглі за мяжу, а сёння 95 % (яны ўжо пішуць адкрыта) хочуць назад вярнуцца: «Вось калі б Аляксандр Рыгоравіч дараваў і адкрыў мяжу...» 95 % вярнуліся б. Я не супраць: хто ў турму, хто куды — хто што заслужыў. Трэба вяртацца. Вы там не прыжываецеся», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, многія краіны, куды з'язджалі збеглыя з Беларусі, сталі потым прымаць бежанцаў з Украіны, але ў далейшым, сутыкнуўшыся з праблемамі з-за моцнай міграцыі, пачалі скарачаць аказанне дапамогі перасяленцам з іншых дзяржаў. «Нашы там ужо на падхваце, усе хочуць дадому», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

**Паводле БелТА.**

---

Супрацоўніцтва

# «ПРАБЛЕМА ХАРЧОВАЙ БЯСПЕКІ ЗАЙМАЕ ПЕРШУЮ ПАЗІЦЫЮ Ў ГЛАБАЛЬНЫМ ПАРАДКУ ДНЯ»

**Аб гэтым заявіў Прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка падчас пасяджэння Еўразійскага міжурадавага савета ў пашыраным складзе, паведаміла БелТА. «Наша краіна мае добрыя паказчыкі ўласнай харчовай бяспекі, і фармат адзінага рынку ЕАЭС дае магчымасць паспяхова вырашаць пытанні забеспячэння насельніцтва прадуктамі харчавання, у тым ліку па ўзаемных пастаўках той наменклатуры, якая не вырабляецца ў нашых краінах», — адзначыў Раман Галоўчанка.**

У свеце настаў перыяд эканамічнай турбулентнасці. «Сітуацыя ў сусветнай эканоміцы змянілася. Рост цэн на энерганосьбіты, сыравіну і тавары суправаджаецца агульнасусветным устойлівым ростам інфляцыі, якая б'е шматгадовыя рэкорды ва ўсім свеце. Практычна ўсе сусветныя цэнтры схільны лічыць, што свет уваходзіць у эпоху новай эканамічнай рэцэсіі. Становяцца відавочнымі шматлікія праблемы, у тым ліку пагроза голаду ў шэрагу рэгіёнаў свету, што можа прывесці да наступнай хвалі сацыяльна-палітычных катаклізмаў. Сур'ёзным выклікам для Беларусі і Расіі з'яўляецца аб'яўленая эканамічная вайна, якая накіравана на ізаляцыю нашых краін і раскол нашага саюза, — адзначыў прэм'ер-міністр. — Аднак дзякуючы існаванню ЕАЭС мы не аказаліся адзін на адзін з цяжкасцямі».

Аператыўна была створана рабочая група высокага ўзроўню для павышэння ўстойлівасці эканомік дзяржаў — членаў ЕАЭС. Рэалізоўваюцца меры па забеспячэнні макраэканамічнай стабільнасці, у тым ліку зніжаны стаўкі ўвазных мытных пошлін, дадзены тарыфныя льготы на тавары крытычнага імпарту, аптымізаваны працэдуры мытнага адміністравання, спрошчаны патрабаванні ў сферы тэхнічнага рэгулявання да шэрагу тавараў. «І гэта дае свой плён. Па выніках узаемнага гандлю Беларусі з краінамі ЕАЭС у студзені—красавіку 2022 года мы назіраем рост тавараабароту на 10 працэнтаў, і гэта з улікам высокай базы мінулага года, — падкрэсліў Раман Галоўчанка. — Думаю, такая ж дынаміка ёсць і ў астатніх дзяржаў — членаў саюза».

# РАБОТА ДЗЕЛЯ ПАМЯЦІ І ПРАЎДЫ

## Як пракуратура Мінскай вобласці расследуе справу аб генацыдзе беларускага народа

**Восемдзясят адзін год таму 22 чэрвеня перавярнула жыццё кожнага беларуса. І сёння ў нашай краіне няма ніводнага чалавека, як б не ведаў і не памятаў пра тыя страшныя падзеі. З гэтага года дата 22 чэрвеня адзначаецца як Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа. Нагадаем, што ў красавіку 2021 года была распачата крымінальная справа аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд. Больш за год супрацоўнікі пракуратуры з усёй краіны раскрываюць гістарычную праўду. Як гэта работа вядзецца ў Мінскай вобласці і якія вынікі мае, расказаў пракурор вобласці Юрый ШЧАЦЬКО.**

З моманту ўзбуджэння крымінальнай справы работнікі органаў пракуратуры Мінскай вобласці сістэмна ўключаны ў поўнамаштабную работу. «Праводзяцца допыты асоб з ліку былых вязняў, ветэранаў, партызан і падпольшчыкаў, іх сваякоў, устанаўліваюцца абставіны знішчэння вёсак і месцы няўлічаных пахаванняў. Акрамя таго, устанаўліваецца дачыненне да злачынстваў прадстаўнікоў УАН-УПА, Літоўскіх і Латышскіх паліцэйскіх батальёнаў, Арміі Краёва», — расказаў пракурор. Члены пракурорска-следчай групы Мінскай вобласці па крымінальнай справе правялі больш за 3,5 тысячы следчых дзеянняў: апыталі больш за 2,5 тысячы чалавек, з іх — звыш 1250 вязняў, якія жывуць на тэрыторыі Мінскай вобласці, і іх сваякоў.

Вялікая работа праводзіцца ў архівах, музеях і іншых установах, дзе захоўваюцца гістарычныя матэрыялы, якія цікавяць следства. Гэтыя крыніцы аглядаюцца, старанна аналізуюцца і адпрацоўваюцца. Калі інфармацыю трэба ўдакладніць, праводзяцца допыты сведкаў.

Важная частка работы над крымінальнай справай па генацыдзе беларускага народа — пошукі раней невядомых месцаў пахавання. «Знойдзена больш за 50 раней невядомых месцаў пахаванняў. Дзякуючы зладжанай рабоце членаў пракурорска-следчай групы Мінскай вобласці і спецыялістаў пошукавага батальёна летась з зямлі вынята больш за 1,5 тысячы чалавечых астанкаў», — расказаў Юрый Шчацько. Сёлета ў лясным масіве паблізу сталічнага раёна Уручча на падставе ўстаноўленых у ходзе следства звестак знойдзены астанкі больш як 100 чалавек, пошукавыя работы працягваюцца. Пракурор вобласці расказаў, што архіўныя дакументы сведчаць: тут знаходзіцца яшчэ каля 10 магіл, дзве з іх ужо ўстаноўлены. У пасляваенныя гады гэтыя магілы былі ўстаноўлены. Аднак дакладнае месца зафіксавана не было, і таму прыйшлося праводзіць дадатковыя пошукавыя мерапрыемствы, каб знайсці гэтыя магілы. Па словах Юрыя Шчацько, ёсць меркаванні, што ва Уруччы пахавана больш за 50 тысяч чалавек. Таксама ён расказаў, што, дзякуючы паказанням сведкаў, у вёсцы Ніўкі Мядзельскага раёна было знойдзена масавае пахаванне з астанкамі 50 чалавек. На мінулым тыдні іх урачыста пахавалі, а бязвінным ахвярам паставілі помнік.

Акрамя таго, у ходзе следства ўстаноўлена звыш 40 раней невядомых населеных пунктаў Мінскай вобласці, спаленых нямецка-фашысцкімі захопнікамі і іх памагатымі.

Амаль уся гэтая інфармацыя знаходзіцца ў адкрытым доступе, і кожны можа яе ўбачыць у звычайным краязнаўчым музеі. «У нас ёсць інфармацыя, шмат гісторый, шмат новых дакументаў знойдзена. Таму было прынята рашэнне па адкрыцці адпаведных экспазіцый у музеях. Зусім хутка будзе адкрыта экспазіцыя абласнога ўзроўню на базе краязнаўчага музея Мінскай вобласці ў Маладзечне. У першую чаргу, гэтыя экспазіцыі разлічаны на маладое пакаленне. Мы спадзяёмся, што дзеці будуць спачатку наведваць экспазіцыі ў сваіх раёнах, а потым наведваюць абласны краязнаўчы музей. Мы шмат сіл уклалі, каб гэтая экспазіцыя была адкрытая. Там будзе ўся інфармацыя, якую нам удалося атрымаць за час расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа», — расказаў пракурор Мінскай вобласці.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Тэхас налета плануе аддзяліцца ад ЗША



Прадстаўнікі Рэспубліканскай партыі ад штата Тэхас жадаюць правесці рэферэндум, каб штат мог аддзяліцца ад ЗША. Пра гэта паведаміла РІА «Навіны». У прыватнасці, на нядаўнім мясцовым з'ездзе палітычнага аб'яднання была прынятая рэзалюцыя, у якой разглядаецца варыянт выхаду Тэхаса са складу Злучаных Штатаў. У дакуменце падкрэсліваецца, што федэральны ўрад парушыў канстытуцыю Тэхаса, пазбаўшы рэгіён права на самакіраванне. «Правы Тэхаса на ўнясенне паправак ігнаруюць, адхіляюць і анулююць», — адзначаецца ў рэзалюцыі з'езда. Прапануецца правесці ў 2023 годзе рэферэндум у штаце, каб пераўтварыць статус суб'екта ЗША ў незалежную дзяржаву. Таксама ў іншым раздзеле рэспубліканцы адзначылі, што не прызнаюць вынікаў прэзідэнцкіх выбараў у 2020-м і, адпаведна, паўнамоцтваў Джо Байдэна.

### У Вялікабрытаніі праходзіць найбуйнейшая забастоўка супрацоўнікаў чыгункі



Самая буйная з 1989 года забастоўка супрацоўнікаў чыгункі пачалася ў Вялікабрытаніі на фоне інфляцыі і росту кошту жыцця, паведамляе ТАСС. На працягу некалькіх дзён па большасці маршрутаў рух будзе поўнасцю прыпынены. Некаторыя цягнікі, якія прадоўжаць хадзіць, будуць спыняцца не на ўсіх станцыях. Паводле ацэнак кампаніі Network Rail, функцыянаванне чыгункі можа быць парушана не толькі на запланаваныя тры дні, але і на суседнія даты. Чакаецца, што ў забастоўцы возьмуць удзел каля 40—50 тысяч чалавек. Прычына такой маштабнай акцыі — нязгода брытанскага чыгуначнага, марскога і транспартнага прафсаюза RMT з планамі кіраўнікоў кампаній замарозіць павышэнне заробкаў супрацоўнікаў і звольніць частку з іх, павялічыць працягласць працоўнага дня з 35 да 40 гадзін у тыдзень, а таксама скараціць праверкі бяспекі і закрыць касы па продажы квіткоў. Падчас перагавораў паміж RMT і работадаўцамі не ўдалося дасягнуць кампрамісу. Адзначаецца, што забастоўка негатыўна адаб'ецца на мільёнах жыхароў Вялікабрытаніі.

### Новую папуляцыю белых мядзведзяў знайшлі ў Грэнландыі



На паўднёвым ускодзе Грэнландыі, на беразе Дацкага праліва, навукоўцы выявілі новую папуляцыю белых мядзведзяў, паведаміла Euronews. Генетычныя даследаванні паказалі, што там жыве зусім асобная група, якая вельмі рэдка кантактуе з іншымі. Пра яе было вядома і раней, але лічылася, што драпежнікі не жывуць там увесь час, а мігруюць уздоўж усяго ўзбярэжжа. Навуковец Бэт Шапіра з Каліфарнійскага ўніверсітэта ў Санта-Крузэ распавёў, што выяўленая група мядзведзяў з паўднёва-ўсходняй Грэнландыі вельмі моцна адрозніваецца генетычна ад усіх сваіх суседзяў. Галоўная іх асаблівасць у тым, што яны адаптаваліся да палявання на прэснаводным лёдзе — гэта аскепкі грэнландскіх леднікоў, якія спаўзаюць у моры. Такім чынам, на мядзведзяў не ўплывае раставанне марскога лёду, і яны, у тэорыі, лепш абаронены ад наступстваў глабальнага пацяплення.

# НАСТАЎ ЧАС ДАЗНАЦЦА ІСЦІНУ

## Дакументальнае выданне аб генацыдзе беларусаў прэзентуюць у гарадах краіны



**У дні, калі згадваюцца пачатак самай страшнай для Беларусі вайны і яе ахвяры, у розных гарадах краіны праходзяць прэзентацыі кнігі «Аб генацыдзе беларускага народа», якая выйшла ў выдавецтве «Беларусь» пад агульнай рэдакцыяй генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь, доктара юрыдычных навук Андрэя ШВЕДА.**

— Ужо больш за год органамі пракуратуры Рэспублікі Беларусь працягваецца расследаванне крымінальнай справы па факце генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд. На сёння ў рамках расследавання дапытана больш як 14 500 сведкаў, большая частка з якіх — былыя вязні канцэнтрацыйных лагераў. Праведзены тысячы аглядаў, у тым ліку і месцаў здарэнняў, у ходзе якіх намі ўстаноўлена больш за 500 раней не вядомых месцаў масавага знішчэння мірных жыхароў. На жаль, з моманту пачатку расследавання папоўніўся істотна і спіс населеных пунктаў, якія былі знішчаны ў гады акупацыі, і цяпер гэтая лічба складае больш за 9500, — распавёў **намеснік начальніка ўпраўлення па наглядзе за расследаваннем асабліва важных крымінальных спраў Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь Сяргей ШЫКУНЕЦ** падчас прэзентацыі ў Мінску. — Сур'ёзную дапамогу ў расследаванні справы аказваюць прадстаўнікі Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага камітэта судмедэкспертыз, Міністэрства абароны, супрацоўнікі архіваў, гісторыкі. Без іх дапамогі мы не справіліся б з такім вялікім пластом інфармацыі, якую патрэбна было вывучыць і прааналізаваць. Вынікі расследаванай справы, якія на сёння ўжо маем, і леглі ў аснову стварэння кнігі. Хачу вам сказаць, што ў гэтым выданні — тая адзіная і сапраўдная праўда, заснаваная непасрэдна на матэрыялах крымінальнай справы, на аналізе дакументаў, якія маем.

— Колькасць новых дакументаў, што выяўляюцца сёння, часам проста здзіўляе нават тых, хто ўжо шмат ведае ў гэтай тэме, — адзначыў **дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Вадзім ЛАКІЗА.** — Пад эгідай Генеральнай пракуратуры і Нацыянальнай акадэміі навук рыхтуецца да выхаду ў свет навукова-даследчая работа «Генацыд беларускага народа: гісторыка-прававы аспект». У ёй знайшлі адлюстраванне як гістарычныя моманты, так і пытанні, звязаныя з прававым аспектам, што неабходна і важна. На жаль, сёння цяжка бывае атрымаць доступ да архіваў у іншых краінах, каб ва ўсёй паўнаце сабраць і паказаць гістарычную праўду.

На прэзентацыі ў Брэсце расказалі, што кожны раздзел кнігі змяшчае звесткі пра канкрэтны рэгіён. Што ні абзац — то спасылка на архіў, а ў ім факты з крымінальнай справы, факты, якія скрупулёзна праверены. Такія, напрыклад, як звесткі пра забойствы амаль 20 тысяч чалавек у канцэнтрацыйным лагеры каля вёскі Калдычэва ў Баранавіцкім раёне альбо расстрэл 50 тысяч грамадзян ва ўрочышчы Бронная Гара Бярозаўскага раёна. Выяўлены цэлы шэраг новых фактаў — прыкладна 500 — зверскай расправы над людзьмі.

— Варта прызнаць, што быў перыяд у нашым жыцці, калі мы палічылі, што «фашызм», «генацыд» — паняцці, якія раз і назаўсёды сыходзяць з нашага жыцця. Але мы памыліліся, — сказаў **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.** — І нацызм, і розныя праявы генацыду ўзнікаюць, на жаль, у новых формах. І сённяшняе мерапрыемства накіравана на тое, каб не дапусціць гэтую навалу ў наша грамадства, каб дакладна размяжоўваць паняцці дабра і зла.

**Пракурор горада Брэста Андрэй ВАЛАДЗЬКО** расказаў пра работу над кнігай, пра тое, як знаходзілі новыя матэрыялы, апытвалі сведак, якая пошукавая работа была праведзена ў кожным раёне, паведаміў, што работа працягваецца.

— Калі чытаеш гэтыя матэрыялы, тыдзень не можаш спаць, — сказала **галоўны рэдактар выдавецтва «Беларусь» Ларыса ЯЗЫКОВІЧ.** — Успаміны, сведчанні відавочцаў аб тым, як зганялі людзей, як штыкамі калолі, жывымі ў яму скідвалі, як спальвалі жыўцом — гэта не можа не кранаць, не можа не пакідаць зарубін на сэрцы. Гэта складана нейкім чынам асэнсаваць і даваць... Раней мы думалі, што ўсё ўжо напісана пра вайну, усё сказана, усё даследавана. Аказваецца, не ўсё. Таму падобныя кнігі патрэбныя, трэба, каб з імі знаёмілася кожнае пакаленне. Гістарычная праўда ў дакументах і фотаздымках не выклікае сумненняў, не дапускае іншых трактовак.

Кніга разлічана на шырокае кола чытачоў, не толькі на гісторыкаў, музейных работнікаў — у ёй знойдуць патрэбны матэрыял настаўнікі, журналісты, ідэолагі, ды і ўсякі, хто цікавіцца сваім мінулым.

«Кніга павінна быць у кожнай бібліятэцы, — выказала сваё меркаванне ўдзельніца прэзентацыі ў Брэсце пенсіянерка Марыя Валасовіч. — Яе павінны чытаць маладыя».

**Алена ДРАПКО, Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## Іван Эйсмант:

# «У Беларусі трэба ствараць суверэнны інтэрнэт. Дарага, складана, але неабходна!»

**Напрыканцы вясны медыйная супольнасць Беларусі і прыхільнікі айчынных СМІ сталі сведкамі грандыёзнага свята прафесіяналізму. Пасля даволі вялікага перапынку да нас вярнулася «Тэлевяршыня». Арганізатарам цырымоніі ўзнагароджання ў гэтым годзе стала Белтэлерадыёкампанія. Мы сустрэліся з яе старшынёй Іванам Міхайлавічам ЭЙСМАНТАМ, папрасілі прыадкрыць заслону тэлевізійнай кухні, падзяліцца сваімі думкамі накont сучаснасці і будучыні нашай журналістыкі, а таксама пракаментаваць прычыны і наступствы санкцый, якія нядаўна былі ўведзены супраць Белтэлерадыёкампаніі.**



***— Іван Міхайлавіч, чаму 14-я прэмія прафесійнага майстэрства «Тэлевяршыня» для медыйнай супольнасці нашай краіны аказалася асаблівай?***

— Тут, безумоўна, шмат прычын. За чатыры гады з правядзення апошняй «Тэлевяршыні» змянілася наша рэчаіснасць, усе мы засумавалі па такіх святочных сустрэчах. Але адна з асноўных, на мой погляд, гэта тое, што мы — супрацоўнікі розных тэлеканалаў — пачалі больш цаніць адзін аднаго, нягледзячы на канкурэнцыю. У гэтым нам дапамог 2020 год. Сфарміравалася сапраўдная каманда кіраўнікоў тэлеканалаў. Ёсць прынцыповыя рэчы, якія мы не хаваем адзін ад аднаго, а, наадварот, абмяркоўваем. Ну, і, канешне, вялікая паўза. Для многіх супрацоўнікаў медыясферы такое мерапрыемства ў жыцці ўпершыню. Ды і час сённяшні: вакол так многа негатыву, а тут свята, адзнака работы, шчырыя словы ўдзячнасці.

***— Які сэнс сёння закладзены ў гэтае свята? І што мы, дзякуючы «Тэлевяршыні», дэманструем нашым апанентам?***

— Цырымоніі ўзнагароджання найлепшых ёсць амаль ва ўсіх сферах. Яны дапамагаюць гуртаваць камандны дух, а дзесьці і падганяюць канкурэнтаў працаваць лепш і больш якасна. Усім прыемна, калі іх работу заўважаюць і адзначаюць. Гэта чалавечыя і сутнасць, і матывацыя. Нашым апанентам, асабліва тым, хто пайшоў з тэлебачання (а многія не проста пайшлі — баязліва збеглі), мы паказалі, што нічога не змянілася, на мой погляд, стала лепш. Прыйшлі новыя людзі, з'явіліся новыя праекты. У пэўным сэнсе гэты рух адбыўся і дзякуючы тым, хто вызваліў месца работы. Аказалася, што ў нас вельмі многа разумных, прыгожых, маладых людзей са сваёй прадзяржаўнай пазіцыяй, якую яны смела транслююць.

***— Хто гэтыя людзі? І чыя работа ў інфармацыйнай прасторы вам асабіста імпануе?***

**«Зараз я спрабую намаляваць свет, дзе выдаляюць на працягу хвіліны з YouTube, дзе закрываюць платформы ў цэлых краінах і на кантынентах, штрафуюць за прагляды тэлеканалаў, а за распаўсюджанне кантэнту беларускіх і расійскіх дзяржаўных СМІ ў некаторых краінах абмяркоўваюць увядзенне крымінальнай адказнасці. Што будзе ў гэтай сувязі з журналістыкай, я не ведаю. Зараз мы знаходзімся ў стане, як перад пачаткам Першай сусветнай вайны».**

— Безумоўна, гэта чацвёрка, якая атрымала прызы «Тэлевяршыні». Грыша Азаронак, Марыя Пятрашка, Ксенія Лебедзева, Ігар Тур. Гэта, канешне, топ-4 самых яркіх журналістаў-аўтараў. Асабіста я памятаю, як да сваёй дзейнасці прыйшлі Ксенія і Марыя. Добра памятаю, як 17 жніўня 2020 года, падчас сустрэчы з калектывам, Ксенія адкрыта задавала мне пытанні накont той сітуацыі, якая складвалася ў нашай краіне. Менавіта тады яна прыняла рашэнне паехаць на «жаночыя маршы», да завадчан. Убачыла ўсё на свае вочы. Ну, а далей, ужо мы з вамі ўсё бачылі ў эфіры. Падобная сітуацыя адбылася і з Грышам Азаронкам, які ў сваіх першых палітычных рэпартажах выказаў думку: «Паглядзіце, не ўсё так адназначна!» Пасля гэтага ён быў проста знішчаны іншым бокам. І гэтым яны ў эфіры абудзілі звера. Так адрэагаваў Грыша — сціплы, талерантны, адукаваны, веруючы чалавек!

Акрамя гэтай чацвёркі, падрастае многа маладых, таленавітых журналістаў і ў сталіцы, і ў рэгіёнах. Самае галоўнае, каб яны ўмелі разважаць, супастаўляць, аналізаваць розныя пункты гледжання.

***— Шмат намінацый было прадстаўлена на «Тэлевяршыні». Якая з іх была самай яркай, а можа, якой не ставала?***

— Гэтым разам у прысуджэнні галоўных прызоў у намінацыях мы вырашылі ісці не ад інтарэсаў тэлеканалаў, як гэта было раней, а ад аўтараў і іх работ. Па сутнасці, менавіта дзейнасць людзей падказала, якіх намінацый не хапала чатыры гады таму. Так пашырыліся інтэрнэт і ТБ-блогеры, аўтарская журналістыка. Менавіта так з'явілася намінацыя «Адзіным фронтам». Гэта была работа калектыву журналістаў розных тэлеканалаў, спалучаная з рызыкай для жыцця і здароўя. Усе памятаюць няпростую сітуацыю з мігрантамі на беларуска-польскай граніцы. Мы зыходзілі з рэалій. Здаецца, ахапілі ўсё. Але ж, на мой асабісты погляд, больш увагі трэба ўдзяліць дакументалістыцы. Створана шмат добрых работ на самыя актуальныя тэмы, у тым ліку і ў рэгіёнах.

***— Якія канцэптуальныя і тэхнічныя новаўвядзенні ваша каманда ажыццявіла ў гэтым праекце?***

— Па-першае, гэта новая пляцоўка. Мы, тэлевізіёншчыкі, кожны раз заганялі сябе не ў свае дэкарацыі. Праводзілі цырымонію то ў філармоніі, то ў Палацы Рэспублікі. Але ж гэтыя лакацыі прызначаны для іншых рэчаў. Мы абралі спартыўную пляцоўку, якая лёгка трансфармуецца і пераўтвараецца ў здымачны павільён. Увіце, як цудоўна для супрацоўніка тэлебачання аказацца ў такіх умовах. Гэта ж сваё, роднае! У аснове задумкі самой цырымоніі — лёгкасць і мінімалізм. Гэта бенефіс людзей, якія атрымлівалі статуэтку. Асаблівую ўвагу ўдзялілі героям, якія ўручалі статуэткі. На сцэну выходзілі і машыніст электрацягніка мінскага метро, і заслужаны настаўнік Беларусі. Дарэчы, працавала над праектам каманда, якая здымала «Х-фактар».

***— «Клуб рэдактараў» атрымаў галоўную ўзнагароду конкурсу. Калі бачыш вашы праграмы, ёсць адчуванне, што за сталом прысутнічаюць аднадумцы, сярод якіх татальнае ўзаемапаразуменне і аніякай канкурэнцыі. Ці так гэта на самай справе? І ці патрэбна вам, кіраўнікам, сённня канкурэнцыя?***

— Канешне, канкурэнцыя патрэбна. Не раз гучалі прапановы аб'яднаць усе вядучыя тэлеканалы краіны і стварыць адзіны медыяхолдынг. На мой погляд, гэтага не трэба рабіць. Трэба даваць магчымасць розным калектывам па-свойму праяўляць сябе. Любы якасны праект матывуе на стварэнне яшчэ лепшага. Калісьці АНТ славілася буйнымі забаўляльнымі праектамі. Мы ў Белтэлерадыёкампаніі гэта бачылі, і нам таксама хацелася стварыць штосьці падобнае. І вось, нарэшце, мы зрабілі «Х-фактар». Сёння такая творчая канкурэнцыя патрэбна, і яна не перашкаджае нам разам не толькі супрацьстаяць выклікам, але і самім атакаваць. Акрамя таго, разам з кіраўнікамі нашых вядучых тэлеканалаў мы зрабілі сапраўдную рэвалюцыю ў медыясферы: дзякуючы нашым намаганням у краіне з'явіўся айчынны вымяральнік, створана кампанія, якая гандлюе рэкламай, змяніўся закон аб рэкламе. Гэта вельмі важныя рэчы для будучыні айчыннага тэлебачання.

***— «Клуб рэдактараў», па сутнасці, дастаўся вам у спадчыну. А ці ёсць у вашых планах удзел у новых праектах?***

— Насамрэч я прымаю актыўны ўдзел у стварэнні некаторых праграм: ідэі, дапамога ў напісанні сцэнарыяў. Напрыклад, праграма «Зразумелая палітыка». Нягледзячы на тое што вядзе яе Сяргей Аляксандравіч Гусачэнка, у эфіры ёсць і мае тэмы. Разам мы даносім да людзей інфармацыю, якую яны не атрымаюць на супрацьлеглым баку. І няхай нас хто-небудзь паспрабуе абвінаваць у тым, што мы кажам няпраўду!

***— Наколькі я разумею, зараз для вас праяўленне ў кантэкстаўным аспекце стварэння праграм больш значнае, чым работа ў кадры?***

— Калі становішся кіраўніком такой вялікай структуры, як Белтэлерадыёкампанія, змяняюцца адносіны да сваёй творчай дзейнасці. Прыходзіцца адказваць за вялікую колькасць гаспадарчых, юрыдычных і фінансавых пытанняў. Без гэтага кампанія не будзе эфектыўна працаваць. Таму зараз я пакідаю за сабой толькі тое, што мне сапраўды цікава. «Клуб рэдактараў» мне цікавы. Я паглыбленны ў інфармацыйны парадак і, праглядаючы ленты навін, бачу столькі фэйкаў, што часам шкадую, што «Клуб рэдактараў» выходзіць не кожны дзень, а раз на тыдзень. Так многа тэм хочацца ўзняць, абмеркаваць, растлумачыць людзям.

***— Якія, на ваш погляд, кірункі сучаснай журналістыкі стануць запатрабаванымі ў будучыні?***

— Зараз я спрабую намаляваць свет, дзе выдаляюць на працягу хвіліны з YouTube, дзе закрываюць платформы ў цэлых краінах і на кантынентах, штрафуюць за прагляды тэлеканалаў, а за распаўсюджанне кантэнту беларускіх і расійскіх дзяржаўных СМІ ў некаторых краінах абмяркоўваюць увядзенне крымінальнай адказнасці. Што будзе ў гэтай сувязі з журналістыкай, я не ведаю. Зараз мы знаходзімся ў стане, як перад пачаткам Першай сусветнай вайны. Нашы контрагенты, бізнесмены з еўрапейскіх краін нават баяцца нам напрамую патэлефанаваць. Праз трэція краіны на нас выходзяць. І гэта называецца свабода!

***— А што такое свабода слова па-еўрапейску?***

— Насамрэч гэта тэма асобнага вялікага інтэрв'ю са спецыялістамі, якія аперыруюць фактамі і лічбамі. Я лічу, што перш чым у нечым папракаць нас, заходнім краінам трэба паглядзець на сябе. Яны закрылі ўсё, штрафуюць людзей за прагляд расійскага і беларускага тэлебачання. Калі пачалася спецаперацыя на Украіне, у нас у Прыбалтыцы было шмат блогераў. Але ж ім прыйшлося пакінуць гэтую тэрыторыю, бо яны давалі нам інтэрв'ю і не адмаўляліся працаваць. Захад можа шмат казаць пра свабоду слова, калі ідзе гаворка пра правы ЛГБТ, пра азеляненне гарадоў, пра глабальнае пацяпленне. Але, як толькі ідзе гаворка пра нацыянальную бяспеку, усе будуць маўчаць. У аснове еўрапейскай свабоды слова — падвойныя стандарты!

***— Белтэлерадыёкампанія, па сутнасці, стала ахвярай такіх стандартаў. Спачатку была прыпынена дзейнасць кампаніі ў Еўрапейскім вяшчальным саюзе. І вось новы віток: 10 чэрвеня БДТРК падпадае пад санкцыі. Што стала прычынай?***

— Афіцыйна прычына заключаецца ў тым, што наша кампанія ў 2020 годзе звольніла сваіх супрацоўнікаў, а на іх месца ўзяла расійскіх журналістаў. Парадокс заключаецца ў тым, што ў самы гарачы час 20-га года я прасіў людзей вярнуцца на работу, а не прымушаў да звальнення. Тая вядомая фраза: «Эйсмант даў дзве гадзіны, інакш будуць звольнены!», якая шырока разышлася ў інтэрнэце, не мае нічога агульнага з рэчаіснасцю. Я даў дзве гадзіны на тое, каб кіраўнікі падраздзяленняў сабралі інфармацыю пра наяўнасць спецыялістаў на рабочых месцах. У нас жа эфір! Мне як кіраўніку холдынга неабходна было разумець, напрыклад, колькі ў нас ёсць рэжысёраў, якія могуць працаваць у прамым эфіры. Каб прымаць адпаведныя рашэнні! Многія людзі прасілі іх звольніць, каб атрымаць палітычны статус і фінансаванне з фондаў. Мы ж заклікалі іх вярнуцца на рабочыя месцы. Заявы на звальненне напісалі тады дзясяткі чалавек, чатырох звольнілі камісійна недзе праз месяц, таму што яны не выходзілі нават на сувязь. Гэта стала першай падставай для санкцый. Другая — расійскія журналісты. У той час у Беларусь прыехалі працаваць калегі з «Russia Today». Канстанцін Прыдыбайла і яго каманда. Вось і ўсё. Але адзін з нашых рэжысёраў у інтэрв'ю апанентам паведаміў, што беларусаў не пускаюць на свае рабочыя месцы. Замест іх прыляцелі два самалёты расійскіх спецыялістаў, якія будуць працаваць у эфіры. Усё гэта лухта і хлусня! Тым не менш цяпер, праз два гады, гэта ўсё легла ў аснову прыняцця санкцый супраць нашай кампаніі. Адкрыю вам невялікую таямніцу: калі ў 2020 годзе паўстала пытанне, а што, калі нам спатрэбіцца дапамога спецыялістаў з-за мяжы, — украінцы былі гатовыя да нас прыехаць!

**«Не раз гучалі прапановы аб'яднаць усе вядучыя тэлеканалы краіны і стварыць адзіны медыяхолдынг. На мой погляд, гэтага не трэба рабіць. Трэба даваць магчымасць розным калектывам па-свойму праяўляць сябе. Любы якасны праект матывуе на стварэнне яшчэ лепшага».**

***— Чым увядзенне санкцый пагражае вашай кампаніі і вашым гледачам?***

— У выніку санкцый на тэлеканале «Беларусь-2», хутчэй за ўсё, не будзе амерыканскіх фільмаў. Таксама мы згубім частку спартыўнага вяшчання на «Беларусь-5». На Захадзе не хочуць, каб жыхары Беларусі глядзелі еўрапейскі футбол? Яны будуць глядзець айчынны і расійскі футбол, будуць слухаць нашы гімны і глядзець на нашы сцягі. Будуць бліжэй да сваёй краіны і нашых саюзнікаў. Дарэчы, у пытанні санкцый не трэба блытаць палітыкаў з бізнесменамі. Апошнія хочуць нармальна жыць і працаваць, але яны страшна баяцца пакарання з боку палітычных эліт.

***— Увядзенне санкцый супраць медыяхолдынгаў — адзін з відаў зброі, пры дапамозе якой зараз вядзецца інфармацыйная вайна. Што трэба рабіць, каб атрымаць перамогу? Ці магчыма гэта ўвогуле?***

— Як гэтаму супрацьстаяць? Па-першае, шляхам увядзення адказнасці за наўмыснае распаўсюджванне фэйкаў. Па-другое, трэба ствараць суверэнны інтэрнэт. Дорага, складана, але неабходна. Нельга выйграць інфармацыйную вайну, знаходзячыся на платформе праціўніка. Напрыклад, у нас на сайце свой відэапрайгравальнік. У выпадку калі YouTube вырашыць заблакіраваць наш відэакантэнт, наш сайт гэта не закране. Але як даносіць сваю пазіцыю да шырокага кола спажыўцоў? Калі разважаць глабальна, сутнасць інфармацыйнай вайны складаецца ў масіраванай інфармацыйнай атацы, падчас якой задзейнічаны ўсе даступныя месенджары і платформы. Таму, безумоўна, сённня неабходна быць канкурэнтаздольным з пункту гледжання тэхналогій. Перафразіруючы словы Уладзіміра Пуціна: «Навошта такі свет, калі ў ім няма Расіі?», магу сказаць адно: навошта нам такі YouTube, калі там няма Беларусі?

**Кацярына ТУМАС-ЦІШКЕВІЧ.**

**Фота прэс-службы Белтэлерадыёкампаніі.**

Як гэта было

# ...ТАДЫ ТАКСАМА ЦВІЛІ ВАСІЛЬКІ,

## альбо Успамін аб няспраўджаным каханні

**...Тая нядзеля ў мяне атрымалася вольнай ад штодзённых клопатаў, і мне (як цяпер помню) захацелася прабегчы па сваіх любімых мясцінках: па Макаравых кусціках, паддуб'і, лажках...**
**Там было столькі ўсяго прыгожага, што (не паверыце!) падмывала жаўранкам узляцець у неба і заспяваць!**
**Але ж гэтага чалавеку не дадзена, таму я, раскінуўшы рукі, прабегла ўніз па сцяжынцы да Лісінага Логу і... спынілася: там сінім воблакам цвілі васількі. Яны былі такія пяшчотна-прыгожыя, што не ўтрымалася — нарвала, спляла сабе вянок, нарвала букецік маме. Думала, яна ўзрадуецца, а тая, наадварот, заплакала. Сказала: «Дачушка, як жа ты падобна на Олю»...**
**Я ведала, што ў мамы была малодшая сястра, што яна памерла ў ліпені 1944-га, але як...**



«За год да вайны, — мама гаварыла ціха, голас яе дрыжаў, — я скончыла тэхнікум, атрымала дыплом і размеркаванне на працу, прыехала на Віцебшчыну ў сваё мястэчка Чарэя. Там жылі мае бацькі, тры сястры і два маленькія брацікі. Усе разам мы палолі грады, бегалі па грыбы і ягады, хадзілі з татам на рыбу, купаліся... Волечка ў вадзе — як тая рыба! Ніхто перагнаць не мог!

Неяк, помню, наплаваліся з ёй, прылеглі адпачыць, і яна прызналася, што сябруе з хлопчыкам, што пасля школы яны дамовіліся разам паступаць у медінстытут...

Мы з сястрычкай сакрэтнічалі, і таму я нават засмуцілася, калі ўбачыла, што да нас падплывае лодка. «Гэта ён, — пачырванеўшы, усміхнулася Оля, — мой Андрэйка».

Хлопец мне спадабаўся: вясёлы, а ўжо ж закаханы...

Мы пераплылі з ім на процілеглы бераг возера. Там, пад стагадовымі дубамі, было настолькі прыгожа, што я ўголас стала чытаць вершы. Волечка слухала, а вось Андрэй... раптам знік. Мы нават хацелі на яго пакрыўдзіцца, але не паспелі, бо ён (і гэтак жа раптам з'явіўся, нават з кветкамі: мне падаў рамонкі, а Волечцы — васількі, ледзь не ахапак!

Мы тады плялі вянкі, лавілі рыбу, варылі юшку, елі... Андрэй аказаўся на здзіў гаспадарлівым: ён прыхапіў з сабою ўсё, што трэба... Мы былі такія шчаслівыя!..

Праз год Оля і Андрэй скончылі школу. Пасля выпускнога доўга гулялі па нашай Замкавай вуліцы, а недзе ў гэты час ужо ішла вайна. У пачатку ліпеня яна дакацілася і да мястэчка. Людзі сталі сведкамі жудаснай расправы над яўрэямі, якія спрадвеку жылі побач, працавалі, ніколі не рабілі зла. І, тым не менш, загінулі тады і старыя, і дзеці, і зусім маладыя хлопцы-дзяўчаткі — аднакласнікі Олі і Андрэя.

...У мястэчку, у царкве, фашысты размясцілі свой гарнізон. Для таго каб знішчыць яго, партызанам патрабаваліся звесткі аб узбраенні, колькасці ворагаў. Каб здабыць іх, мае сёстры Оля і Марыя (на той час — жонка палітрука, з якім паспела паездзіць па гарнізонах, навучылася разбірацца ў зброі, заўважаць замаскіраваныя агнявыя кропкі) хадзілі нібыта да цёткі Насты, што жыла непадалёк ад царквы, адпраўляліся ў іншыя вёскі, каб выканаць тое ці іншае заданне партызан.

Хутка ў іх былі дакладныя звесткі аб гарнізоне: фашысты паставілі кулямёты на званіцах, а самі хаваліся за тоўстымі сценамі. Шмат умацаванняў было і на подступах да мястэчка.

Летам 42-га Марыю арыштавалі, некалькі дзён пратрымалі ў турме. Адзін з паліцаяў перадаў нам адтуль запіску, дзе паведамлялася, што выдаў яе дырэктар школы, што абвінавачваюць — у дапамозе «бандытам», што пагражае расстрэл... Маня прасіла паклапаціцца пра яе дзяцей і развіталася...

Мы, уся сям'я, нічога зрабіць не змаглі. Маню расстралялі восьмага жніўня, а ў верасні партызаны атакавалі мястэчка, знішчылі ўмацаванні на подступах. Праўда, царква і касцёл, дзе заселі фашысты, былі непрыступныя.

У час бою некалькі партызанаў трапілі ў рукі ворагаў, іх кінулі ў падвал мясцовай бальніцы, а доктару Раманаву загадалі зрабіць перавязкі.

Да нас дайшла вестка, што сярод параненых — і Андрэй. Оля адразу ж знікла з дому. Не было яе цэлую ноч, а назаўтра аказалася, што і параненыя, і паліцаі, якія іх ахоўвалі, зніклі.

Фашысты арыштавалі доктара Раманава і яго сям'ю, схапілі многіх мясцовых жыхароў, кінулі ў турму Олю. На допытах яе моцна білі, але яна маўчала.

У гэты ж дзень партызаны пайшлі на вырашальны штурм, адбілі ў немцаў мястэчка і ўсіх зняволеных.

Олю дадому Андрэй прынёс на руках. Яна не магла стаяць, не магла размаўляць...

Але ж паступова сілы вярталіся, і яна, відаць, выжыла б, калі б немцы не ўзяліся бамбіць мястэчка. Людзям даводзілася хавацца ў зямлянках. Там ад сырасці, холаду і голаду многія пачыналі хварэць, а ўжо малыя ды нездаровыя...

Ад запалення лёгкіх памёр наш маленькі Гена, сын Марыі, пагоршала і Волечцы. А калі яна пачула, што ў час бою загінуў Андрэй, то злягла зусім...

Неяк раз, праўда, паклікала мяне і сказала: «Вось каб лыжачку мёду... Я, здаецца, з'ела б і адразу паправілася».

Іголку ў стозе сена адшукаў бы тады прасцей, чым мёд у спустошаных вёсках! Але ж я ведала, што трэба зрабіць, каб выратаваць сястру, і таму, не раздумваючы, рушыла ў дарогу.

Знаёмыя вёскі сустракалі мяне комінамі знішчаных хат, па бязлюдных вуліцах бегалі здзічэлыя сабакі. Мне было страшна, але я не спынялася — бегла, ішла і прасіла людзей, каб дапамаглі. Мне спачувалі, нешта раілі, але мёду не меў ніхто. Хіба ўрэшце...

Дзед, да якога дайшла ледзь не ноччу, даведаўшыся, адкуль, вынес чарачку. У ёй быў мёд. Ад радасці я ўпала на калені і пацалавала старому руку. Яго большай унучцы аддала сваю апошнюю кофтачку і пабегла дамоў — ратаваць сястру.

Для яе ж непадалёк ад дома нарвала букет васількоў.

Волечка яшчэ ўбачыла яго, паднесла да вуснаў, пачула, што я прынесла мёду, усміхнулася і быццам бы заснула...

У той жа дзень, 13 ліпеня, сястрычкі маёй не стала.

Пахавалі яе ў белай сукенцы, у вяночку, з букецікам васількоў».

...Я пачула гэты аповед вельмі даўно, калі была зусім маладой. Потым мы з мамай неаднойчы ездзілі на яе Бацькаўшчыну, у мястэчка Чарэя. Былі і на магіле Олі, побач з якой, зусім непадалёку, пахаваны яе Андрэй.

...Што, можа, цікава, мамачка мая памерла ў той самы 13-ы ліпеньскі дзень, як і яе сястра.

Васількі на іх магілы прыносяць мае ўнукі.

**Тамара КОХАН,**
**Мінскі раён.**

Ваеннае пакаленне — мірнаму пакаленню

# «ПОМНІКІ ПАТРЭБНЫЯ НЕ МЁРТВЫМ...

## Яны патрэбныя жывым»

**Мне было ўсяго пяць гадкоў, але той першы дзень вайны я цудоўна помню.**

Тата з раніцы пайшоў на завод і хутка вярнуўся — ужо з павесткай: на вакзал, да цягніка, які адпраўляўся на фронт, яму трэба было ісці ў той самы дзень.

Для нас, а найболей для мамы, гэта было як гром сярод яснага неба! Яна плакала, хапалася за тату, губляла прытомнасць... І гэта пры нас, дзецях.

Не менш дзіўна паводзіў сябе і тата. Ён хапаў на рукі то мяне, то брацікa Геню, то зусім маленькую Зіну, зноў кідаўся да мамы і то цалаваў яе, то адпойваў вадой.

На крык і плач у нашай кватэры зайшоў сусед, які павінен быў працаваць у другую змену. Пачуўшы, што тата атрымаў павестку, ён пабег па сваю, каб не адстаць, каб ісці з ім, разам... А тым часам мы — тата, мама і я (на каго пакінулі малых, я не помню) ужо спяшаліся на вакзал.

Па дарозе тата ўвесь час стараўся супакоіць маму. Ён казаў ёй: «Не бойся! Я хутка вярнуся! З фінскай вайны вярнуўся, — значыць, вярнуся і з гэтай. Бог пашкадуе маіх дзяцей, не пакіне сіротамі... А фашыстаў трэба прагнаць... Вось разаб'ём, пакажам, дзе ракі зімуюць, і я вярнуся. Чакайце!»

Каля цягніка было сапраўднае стоўпатварэнне! Нехта адчайна плакаў-галасіў, нехта нешта крычаў, штурхаўся... І раптам...

Над усім гэтым крыкам-стогнам-адчаем грымнуў... бравурны марш: духавы аркестр іграў «Развітанне Славянкі».

Пад гукі гэтай урачыстай музыкі будучыя франтавікі заходзілі ў вагоны, цягнікі краналіся з месца, набіралі хуткасць... І ўслед за імі, размахваючы сарванымі з галоў хусткамі, беглі жанчыны — жонкі, маці, сёстры... Гэта быў дзень усяленскага смутку, усяленскай бяды, дзень адчаю, дзень слёз...

Нам, дзецям вайны, не забыць гэты плач.

Не забыць усяго перажытага! Сярод прозвішчаў тых, каго прызываў Віцебскі гарваенкамат і хто дамоў не вярнуўся, ёсць прозвішча майго таты — Гапееў Максім Іосіфавіч. Яго партрэт разам з іншымі ў дзень Перамогі па вуліцах Глыбокага праносіць унук — мой сын. І гэты полк сапраўды Бессмяротны.

Час няўмольны. Ён не ідзе — ляціць і, на жаль, забірае з сабой апошніх ветэранаў, удзельнікаў вайны, зараз заступае наша чарга — дзяцей.

Нам ёсць што ўспомніць, ёсць што расказаць (было б каму запісваць!). Нашы пакуты, а найбольш — сапраўдны гераізм жанчын, нашых мам — заслугоўваюць асобных помнікаў!

Іх, дасць бог, некалі паставяць! Не пры нас дык, можа, хоць потым, бо яны патрэбныя: не мёртвым, а жывым. Каб помніць і берагчы мір.

**Зоя НАВАЕНКА (ГАПЕЕВА),**
**г. п. Падсвілле.**

Дзейныя асобы

# «ЁН МНОГАЕ ПАСПЕЎ ЗРАБІЦЬ...»



**На гэтым здымку, справа, Ілья Ісакавіч Глушцоў, які нарадзіўся і жыў на Бялынічыне, працаваў настаўнікам, а калі пачалася вайна, апынуўся на фронце.**

Ваяваў, што называецца, ад званка да званка, узнагароджаны одэнамі Айчыннай вайны першай і другой ступеняў, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За ўзяцце Берліна» і многімі іншымі...

На радзіму Ілья Глушцоў вярнуўся летам 1946-га. Аднак да роднай Магілёўшчыны не дабраўся: спыніўся на Зэльвеншчыне, пазнаёміўся з мясцовай прыгажуняй — пажаніліся, гадавалі сына і дачку. Працаваў франтавік настаўнікам, дырэктарам Мештавіцкага дзіцячага дома і Бародзіцкай школы. Пасля вайны праблем усяды хапала, але Ілья Ісакавіч умеў іх вырашаць. Ён многае паспеў зрабіць і для ўстаноў, дзе працаваў, і для адукацыі наогул. У 1968 годзе яму было прысвоена званне «Заслужаны настаўнік БССР».

...Вайна моцна падарвала яму здароўе: франтавыя раны не далі дажыць нават да пенсіі. Аднак тое, што мог зрабіць для людзей, ён зрабіў.

**Сяргей ЧЫГРЫН,**
**г. Слонім.**

Знарок бы не прыдумаў

# А «ПАТАННЕЙ» НІЧОГА НЕ БЫЛО...

**Роднае слова... Якое ж яно цёплае, якое блізкае! Здавалася б, толькі бяры яго — карыстайся! Але ж не, як пагляджу, мала ахвотных. Куды болей тых, хто цураецца...**

У вёсцы, дзе я нарадзіўся, па-беларуску гаварылі ўсе. На рускую пераходзілі хіба начальнікі, але сам гэты пераход даваўся ім цяжка і пачынаўся з такой трасянкі...

Помню, у школу разам са мной хадзілі дзве стрыечныя сястрычкі — дочкі родных братоў. Адзін з іх быў трактарыстам, але ж весяльчак, гаварун, артыст... У клубе ставілі камедыю «Лявоніха на арбіце», дык ён сыграў Лявона, прычым так, што ім і застаўся — займеў мянушку.

Брат яго быў зусім іншы: дужа ганарыўся, што выбіўся ў начальнікі (хоць і малыя), аж са скуры вылузваўся — стараўся размаўляць па-руску. І дачцэ загадаў.

Тая, ужо старшакласніцай (сведкі расказвалі), летам зайшла ў краму — стала выбіраць тканіну (тады многія шылі). Паглядзела і адну, і другую, а грошай, мусіць, мала было?

— *Потанее нету?* — спытала ў прадавачкі.

Тая памацала паркаль: як быццам і гэты зусім не тоўсты?..

Толькі потым дайшло:

— Танней, — сказала, — няма.

Я гэта да таго, што да дзядзькі гэтай дзяўчыны прыляпілася мянушка Лявон, да яе самой — Танея. А пішу я пра іх для таго, каб нагадаць сынам Багушэвіча, што добра ведаць мову суседскую, але ж найперш трэба ведаць сваю. І не прадаваць яе ні за якія грошы! А тым больш «патанней».

**М. КАМАРОЎСКІ,**
**г. Орша.**

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

# ВАМПІРЫ СЯРЭДНЯЙ ПАЛАСЫ

## Як абараніць сябе ад камароў і іншых крывасмокаў



**Лета на дачы ці ў вёсцы — неверагодная асалода! Калі б не камары ды мухі. А яшчэ пчолы, восы, шэршні і сляпні. У хаце ад гэтай крылатай «жыўнасці» добра абараняюць фумігатары, але варта ў гарачы дзень выйсці на вуліцу ці пайсці на рэчку, як цябе тут жа абляпляе рой машкары. І калі, напрыклад, сляпні, пчолы ды восы найболей актыўныя пры святле сонца, то пасля заходу вахту ў іх пераймаюць камары. Яны дастаўляюць масу непрыемнасцяў, атручваюць цёплыя вечары, не даюць спакойна прагулягца і пасядзець, а наступствы ўкусаў сверб і хваравітасць надоўга застаюцца на целе. Як абараніцца ад усіх гэтых кусачых насякомых, расказала памочнік урача-гігіеніста аддзела гігіены Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Таццяна ЛЯШКЕВІЧ.**

### НЕ ДАЙ СЯБЕ ЎКУСІЦЬ!

Асабліва прывабныя для камароў і сляпнёў дзеці. Скура ў іх далікатная, тонкая, пракусіць яе прасцей за ўсё, ды і адмахвацца ад гэтых насякомых малыя яшчэ толкам не навучыліся. А вось што да асаблівай прыхільнасці гэтых вампіраў да той ці іншай групы крыві, то гэта ўсяго толькі міф. Не такія яны гурманы. Як абараніць сябе, дзяцей і гадаванцаў ад крывасмокаў? У гэтым могуць дапамагчы спецыяльныя прэпараты — рэпеленты.

— Рэпелент (з лацінскай «які адштурхоўвае») — прыроднае або сінтэтычнае хімічнае рэчыва, якое ўжываецца ў бытавых мэтах для адпужвання насякомых. Яго ўжываюць для абароны чалавека ад нападу крывасмокаў (камароў, сляпнёў, мошак) і кляшчоў, а таксама для абароны прадметаў ужытку і адзення ад псавання моллю і жукамі. У адрозненне ад інсектыцыдаў рэпеленты прызначаны не для знішчэння насякомых, а толькі для іх адпужвання, — тлумачыць спецыяліст.

### ЯК ВЫБРАЦЬ РЭПЕЛЕНТ?

Кожны рэпелентны сродак павінен мець пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі, нумар якога пазначаны ў дакументах для продажу (гэта можна ўдакладніць у прадаўца). Уся інфармацыя аб прызначэнні сродку, вытворцы, спосабе прымянення і мерах засцярогі пры ўжыванні выкладзена на этыкетцы сродку, распрацаванай падчас яго дзяржаўнай рэгістрацыі.

— Формы рэпелентных сродкаў разнастайныя. Частку з іх можна наносіць толькі на скуру, некаторыя — і на скуру на адкрытыя часткі цела, і на адзенне. Для нанясення толькі на скуру прызначаны крэмы, гелі, ласьёны, алоўкі, эмульсіі і сурвэткі. Аэразольныя ўпакоўкі падыходзяць для нанясення і на скуру, і на адзенне. Перавагі нанясення рэпелента на адзенне ў тым, што эфект доўжыцца некалькі сутак, прытым таксічнасць мінімальная, — кажа Таццяна Ляшкевіч.

Працяглаcць эфекту залежыць ад канцэнтрацыі рэпелентнага рэчыва. Рэпеленты з высокім утрыманнем таксічнага рэчыва адпужваюць кляшчоў, але не забіваюць. Для абароны ад кляшчоў больш эфектыўныя спецыяльныя сродкі.

Асобную ўвагу трэба ўдзяляць выбару рэпелента для абароны дзяцей. Набывайце рэпеленты толькі ў аптэках або буйных сеткавых крамах. Пры пакупцы звяртайце ўвагу на тэрмін прыдатнасці і цэласнасць упакоўкі.

— Узрост — галоўнае. На кожным сродку ўказаны ўзрост, для якога ён прызначаны. Катэгарычна не дапускаецца выкарыстоўваць для абароны дзяцей рэпеленты для дарослых. Як правіла, яны больш канцэнтраваныя, чым дзіцячыя. Гэта можа прывесці да атручэння, — звяртае ўвагу суразмоўца.

Калі вы катэгарычна не прымаеце хімічныя прэпараты, можна выкарыстоўваць натуральныя. Яны не такія эфектыўныя, як хімічныя, хутчэй выветрываюцца, іх трэба часцей абнаўляць, але яны больш бяспечныя.

### КАБ ЗМЯКЧЫЦЬ НАСТУПСТВЫ ЎКУСУ...

Найперш трэба прадэзынфікаваць пацярпелае месца. Дзецям яго можна прамыць халоднай вадой з дзіцячым мылам, а пасля апрацаваць антысептыкам, напрыклад, хлоргексідзінам. Дарослым — апрацаваць разведзеным вадой медыцынскім, нашатырным або борным спіртам ці проста вадой, змяшанай з любым адэкалонам або спіртзмяшчальнай настойкай.

На апрацаванае месца варта прыкласці лёд. Крывяносныя сасуды звузяцца, і яд запаволіць праходжанне па арганізме. Халодны кампрэс не толькі аблегчыць сверб, але і здыме ацёк. Але доўга трымаць холад нельга — гэта трэба рабіць з перапынкамі, а саму лядышку лепш закруціць тканінай.

Можна ўжыць антыгістамінныя прэпараты (унутр і вонкава). Пры лёгкай рэакцыі дастаткова памазаць укушанае месца спецыяльнай маззю. Пры сярэдняй цяжкасці сімптомаў могуць спатрэбіцца гарманальныя мазі, але лепш, каб іх парэкамендаваў урач. Таксама могуць спатрэбіцца таблеткі ад алергіі.

Ад свербу можна выкарыстоўваць мясцовыя сродкі. Напрыклад, мазі. Пажадана, каб мазь была на тлушчавай аснове, якая стварыць на скуры плёнку і абмяжуе распаўсюджванне ўпырсканай камарам сліны.

Пашкоджаную скуру можна апрацоўваць антысептыкамі і зялёнкай. Мазь з антыбіётыкам прызначае толькі ўрач.

### НАРОДНЫЯ СРОДКІ АД НАСЯКОМЫХ

Надзейным сродкам абароны ад мух, камароў і іншых казурак на дачы з'яўляецца металічная або капронавая сетка, прымацаваная да вокнаў і фортак. Сетку, замацаваную на драўлянай раме, можна ўставіць у праём дзвярэй.

Каб камары не заляталі ў пакой (і каб выгнаць іх з хаты), насыпце на гарачую патэльню крыху камфары. Камфарны дым не шкодны для людзей, а камары яго не выносяць. Каб адагнаць мух і камароў ад акна, замацуйце ў яго верхняй частцы планку або шнур з доўгімі стужкамі з поліэтыленавай плёнкі.

У выграбныя ямы прыбіральняў, размешчаных у двары, для знішчэння мух варта сыпаць 2-3 разы на месяц хлоркавую вапну або заліваць 1% раствор карбафосу (100 грамаў на 3 літры вады).

Адпудзіць ад сябе камароў, мошак, маскітаў, сляпнёў пры адсутнасці рэпелентаў можна сумессю з 30—40 мілілітраў любога адэкалону і 5—10 кропель гваздзіковага або анісавага алею, якія можна замяніць некалькімі кроплямі валяр'яны.

Каб адпудзіць вос і пчол, адкрытыя ўчасткі цела праціраюць сумессю любога адэкалона з мятным маслам або мятнымі кроплямі (5 кропель на сталовую лыжку адэкалона). Сродак валодае ахоўным дзеяннем каля гадзіны.

---

# ПАМІЖ ДВУХ АГНЁЎ

## Чаму бацькам не варта высвятляць адносіны пры дзецях?

**З ранняга дзяцінства менавіта ў сям'і мы вучымся ўзаемадзейнічаць з блізкімі, любіць, прымаць сябе і навакольных. «Спрыяльны клімат» і ўзаемную павагу, на жаль, не заўсёды атрымліваецца сустрэць у сям'і. Высвятляючы адносіны паміж сабой, лаючыся і скандалячы, бацькі наносяць непапраўны ўрон дзіцячай псіхіцы. Сямейныя «разборкі» развіваюць пачуццё няўпэўненасці ў сабе, неабароненасці і нават часам пазбаўляюць даверу да свету. Чым дрэнныя канфлікты бацькоў на вачах у дзяцей і чаму нельга ўпадаць у іншую крайнасць — цалкам іх хаваць ад дзяцей? Пра гэта размаўляем разам з псіхолагам сталічнага клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Аляксеем БЕЛАЦАРКОЎЦАМ.**

Частыя канфлікты дарослых і размовы на павышаных танах можна сустрэць не толькі ў нешчаслівых сем'ях, але і, як прынята лічыць, ва ўзорна паказальных. Бо часта за вонкавым «фасадам» дабрабыту і дастатку хаваюцца адносіны вельмі дырэктыўныя і абсцэнільвальныя. Ад бацькоў можна нярэдка чуць: «Дзіця яшчэ маленькае, яно нічога не разумее». Але гэта зусім не так.

— Канфлікты паміж дарослымі ў большасці сваёй маюць негатыўныя, а часам і сумныя наступствы, — кажа суразмоўнік. — Неабходна ўлічваць узроставыя асаблівасці дзяцей і ўсведамляць тыя сітуацыі, якія траўміруюць іх. У сем'ях, дзе праблемы бацькоў вырашаюцца ў прысутнасці дзяцей, нярэдка назіраюцца непаспяховасць у школе ў выніку павышанай трывожнасці, парушэнне сну, пагаршэнне паводзін для прыцягнення ўвагі.

Для такіх дзяцей характэрная адсутнасць пачуцця бяспекі і ўласнай абароненасці, яны могуць адыгрываць негатыўны досвед на больш слабых равесніках альбо, наадварот, станавіцца мішэнню для ціску мацнейшых аднагодкаў. Вуліца становіцца больш камфортным і бяспечным месцам, у тым ліку каб не назіраць прыніжэнне аднаго з бацькоў.

— Калі ў сям'і практыкуецца гвалт, то асабліва хлопчыкам цяжка не мець магчымасці супрацьдзейнічаць бацьку, калі ён крыўдзіць маму. У іх нярэдка назіраюцца бескантрольныя прыступы агрэсіі, якія выліваюцца на аднагодкаў. Дзяўчынкі ў будучыні на падсвядомым узроўні ўступаюць у канкурэнцыю са сваім партнёрам, душачы яго псіхалагічна і спрабуючы адпомсціць бацьку за пакуты маці. Гэта лёгка тлумачыцца такімі прыкладамі, як пасля нярэдкіх сварак муж і жонка часта не могуць нават успомніць, з-за чаго пачалася сварка. Наш негатыўны дзіцячы вопыт накладваецца на наша дарослае жыццё і нікуды не знікае, — папярэджвае псіхолаг.

Пры гэтым дзеці, якія назіралі агрэсію і сцэны гвалту паміж бацькамі, могуць мець шмат спагады ў стаўленні да бацькоў і шчыра шкадаваць іх. Але ўсё гэта зусім не азначае, што калі яны вырастуць, то не працягнуць тую ж лінію паводзін. Пасталеўшы і ўсведамляючы гэта, не ва ўсіх атрымліваецца справіцца з эмоцыямі і пачуццём віны, і ў выніку людзі могуць прыахвоціцца да алкаголю або іншых самаразбуральных формаў залежнасці.

Аднак сустракаюцца і падводныя камяні ў супрацьлеглай стратэгіі выхавання, калі бацькі імкнуцца поўнасцю засцерагчы дзяцей ад магчымасці высвятлення адносін нават у канструктыўнай форме. Муж і жонка па зразумелых прычынах не жадаюць наносіць псіхалагічных траўмаў свайму дзіцяці, цалкам агароджваюць яго ад высвятлення ўзаемаадносін у яго прысутнасці, забываючы аб эмацыянальным фоне.



Вось просты прыклад. Бацькі знаходзяцца ў выдатным настроі, дзіця побач, і ўсе цудоўна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой. Раптам у выніку некаторых дзеянняў мужа ці жонкі ў іншага з'яўляецца пачуццё крыўды. На невербальным узроўні партнёры даюць зразумець адно аднаму, што яны знаходзяцца ў стане канфлікту. Улічваючы іх стратэгію не праяўляць наогул ніякіх негатыўных эмоцый да партнёра, дзіця аказваецца ў поўнай разгубленасці. Толькі што было ўсё так добра, бацькі ўсміхаліся і цудоўна размаўлялі паміж сабой. Яму складана зразумець, што здарылася. Такія дзеці не маюць магчымасці вучыцца канструктыўна ўзаемадзейнічаць з партнёрам у будучыні. Назіраючы за бацькамі, дзіця часцей за ўсё імкнецца ў будучыні выбудаваць мадэль паводзін і ўзаемадзеянні са сваім партнёрам менавіта з досведу, атрыманага ў дзяцінстве.

### Як правільна сябе паводзіць?

— Найперш не варта баяцца абмяркоўваць пры дзіцяці тэму, на якую ў кожнага з бацькоў уласнае меркаванне. Няхай непрыемная сварка ператворыцца ў канструктыўны дыялог. Не выкарыстоўвайце ненарматыўную лексіку і абразы ў адрас адно аднаго. Гэтак жа вельмі непажаданае абясцэньванне аднаго з партнёраў ці прыніжэнне яго значнасці. І калі не грэбаваць гэтымі простымі правіламі, то вы зможаце не толькі пазбавіць сваіх дзяцей ад псіхалагічных паталогій, але і навучыць іх правільна вырашаць канфлікты ў будучыні, — рэзюмуе псіхолаг.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

22 чэрвеня 2022 г. № 23 (659)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


# ЗАХАВАЦЬ ПАМЯЦЬ У СЭРЦЫ

## Беларуска-расійскі патрыятычны праект «Цягнік Памяці» з Брэста накіраваўся ў свой першы рэйс









Фота БелТА.

**ГЭТЫ ўнікальны беларуска-расійскі праект стартаваў 21 чэрвеня ў Брэсце. Пасажырамі цягніка сталі 200 беларускіх і расійскіх школьнікаў, па 100 чалавек ад кожнай краіны. Разам яны праедуць па 15 гарадах Беларусі і Расіі. Хлопцы і дзяўчаты наведаюць памятныя мясціны, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной, сустрэнуцца з ветэранамі, прымуць удзел у тэматычных сустрэчах, убачаць многія славутасці, культурныя, гістарычныя аб'екты. А галоўнае, пазнаёмяцца, будуць шмат камунікаваць, абменьвацца думкамі і меркаваннямі.**

«Цягнік Памяці» не мае аналагаў, раней нічога падобнага не праводзілася. А ідэя нарадзілася падчас адной з сустрэч кіраўнікоў верхніх палат парламентаў краін — Старшыні Савета Федэрацыі Расіі Валянціны Матвіенкі і Старшыні Савета Рэспублікі нашай краіны Наталлі Качанавай. У снежні мінулага года сенатары абмяркоўвалі розныя аспекты работы з маладым пакаленнем. Тады ж было дадзена даручэнне распрацаваць праект, які пасадзейнічае прыцягненню маладых людзей да вывучэння гісторыі. Хутка нарадзілася агульная канцэпцыя праекта, арганізатары вырашылі звязаць даты — 22 чэрвеня — дзень пачатку вайны — і 3 ліпеня — дзень вызвалення Мінска. Яны і сталі храналагічнымі рамкамі паездкі.

Расійскія ўдзельнікі акцыі прыбылі ў Брэст у 13 гадзін 21 чэрвеня. На вакзале іх сустракалі беларускія ўдзельнікі праекта разам з аркестрам 38-й Брэсцкай асобнай дэсантна-штурмавой брыгады. На прывакзальную плошчу прывітаць юнакоў і дзяўчат таксама прыбылі кіраўнік Брэсцкага гарадскога Савета Мікалай Красоўскі, намеснік старшыні аблвыканкама Генадзь Барысюк, дэпутаты, сенатары.

Першыя словы наказу прагучалі з вуснаў **намесніка старшыні Савета Федэрацыі РФ Канстанціна КАСАЧОВА.** Ён пажадаў школьнікам добрай дарогі, цікавых сустрэч і незабыўных уражанняў. Са шчырымі словамі пажаданняў да калегі далучыўся **беларускі сенатар Віктар ЛІСКОВІЧ.**

Крыху пазней Канстанцін Касачоў адзначыў, што арганізатары маюць намер развіваць праект. Налета да беларускіх і расійскіх школьнікаў запрасяць далучыцца іх равеснікаў з краін — удзельнікаў АДКБ, потым спіс будзе пашырацца. А на юбілейным «Цягніку» 2025 года ў шэрагах пасажыраў мяркуюць убачыць таксама маладых людзей з краін Усходняй і Заходняй Еўропы, словам, усіх, хто пажадае далучыцца да асветніцка-патрыятычнай акцыі.

...Першыя сустрэчы, першыя ўражанні заўсёды хвалюючыя. Імі падзяліліся з карэспандэнтам расійскія школьніцы. Кацярына Ісаенка прыехала з Краснаярска.

— З першых хвілін мяне ўразіла цёплая сустрэча, добразычлівасць людзей на беларускай зямлі, — сказала Каця. — Спадзяюся, што тут мы знойдзем сяброў на ўсё жыццё. Соня Шаўчук з Наўгародскай вобласці, як і яе таварышка па паездцы, раней ніколі не была ў Беларусі:

— І хоць надвор'е падрыхтавала нам маленькія выпрабаванні, атмасфера тут дружалюбная, цёплая, усё падабаецца. Лічу вялікім гонарам для кожнага з нас удзел у гэтым праекце. Вельмі добра, што наш маршрут пачынаецца ў Брэсце, я даўно марыла пабываць у Брэсцкай крэпасці, пра якую нам расказвалі на ўроках гісторыі, а тут ёсць магчымасць убачыць на свае вочы. Наогул, люблю бываць у музеях, адкрываць нешта новае. Спадзяюся, што і беларускім сябрам спадабаюцца экскурсіі ў расійскіх гарадах.

Афіцыйная частка сустрэчы «Цягніка Памяці» прайшла ў Брэсцкім тэатры лялек. Удзельнікаў прывітала **Наталля КАЧАНАВА.**

— Вельмі знакава, што мы сустракаемся з вамі на гераічнай брэсцкай зямлі, — сказала Наталля Іванаўна, — адсюль пачынаецца шлях праекта. Калі мы гаворым пра вайну, успамінаем Брэст, таму што адсюль 81 год назад пачала сваё шэсце на нашай краіне тая страшная вайна. Месцам трагедыі і гераізму стала Брэсцкая крэпасць. Менавіта сюды ідуць людзі кожны год у чатыры гадзіны раніцы, каб аддаць даніну павагі і смутку. Спадзяюся, што праект дапаможа захаваць памяць у вашых сэрцах, і вы будзеце з часам перадаваць памяць далей, новым пакаленням, каб захоўваць мір, бо нічога чалавеку не патрэбна, калі няма міру і спакою. Мы задумалі гэты праект для таго, каб вы самі ўсё ўбачылі і адчулі, каб пачулі праўду аб вайне з першых вуснаў. У вас будзе такая магчымасць.

Мадэратарам сустрэчы ў тэатры выступіў кіраўнік Беларускага саюза журналістаў Андрэй Крывашэеў. Ён заклікаў удзельнікаў праекта расчахляць свае гаджэты падчас паездкі, здымаць і расказваць равеснікам пра знакавыя месцы, напрыклад, пра абарону крэпасці ў Брэсце, пра бітву пад Ржэвам, блакаду Ленінграда, калі будуць у названых гарадах.

Урачыстая цырымонія старту беларуска-расійскага праекта адбылася ў Брэсцкай крэпасці. На плошчы Цырыманіялаў да ўдзельнікаў акцыі далучыліся юнармейцы Паста Памяці. Дзеці абмяняліся сімваламі акцыі, разам усклалі кветкі да Вечнага агню.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Ахова здароўя — прыярытэт сацыяльнай палітыкі

## Расказваем важныя навіны мінулага тыдня

● Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава прыняла ўдзел у цырымоніі ўшанавання пераможцаў прафесійнага конкурсу «Урач года Рэспублікі Беларусь», прымеркаванага да Дня медыцынскага работніка.

Вітаючы ўдзельнікаў мерапрыемства, спікер адзначыла, што ахова здароўя — асноўны і прыярытэтны напрамак у сацыяльнай палітыцы краіны. «Вы бачыце, што нават у няпросты час санкцыйнага ціску будуюцца новыя ўстановы, рэканструюецца дзеючыя, набываецца новае тэхналагічнае абсталяванне. Ідзе пастаяннае ўдасканаленне сістэмы. Але самае галоўнае — гэта людзі, якія тут працуюць. Таму дзяржава ніколі не адыходзіла ад таго, каб гэта было асноўным напрамкам сацыяльнай палітыкі», — падкрэсліла яна.

У рамках цырымоніі Наталля Качанава ўручыла медыцынскім работнікам падзякі Старшыні Савета Рэспублікі за вялікі ўклад у рэалізацыю сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь, добрасумленную работу і высокі прафесіяналізм. Спікер падзякавала медыкам за няпростую і нялёгкую, але такую патрэбную нашай краіне і народу працу.

● У Мінску прайшло пасяджэнне Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, у якім прынялі ўдзел члены Савета Рэспублікі: Валерый Гайдукевіч, Аляксей Кушнарэнка, Віктар Лісковіч, Алег Портнік, Сяргей Рачкоў, Таццяна Рунец, Міхаіл Русы, Сяргей Сівец, Андрэй Шышкін, Анатоль Шчасны. Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл Русы выбраны намеснікам Старшыні Парламенцкага сходу. Зацверджаны новыя склады камісій. Члены Савета Рэспублікі былі ўведзены ў склад камісій Парламенцкага сходу. Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў выбраны старшынёй камісіі ПС па міжнародных справах, міграцыйнай палітыцы і сувязях з суайчыннікамі.

Падчас пасяджэння саюзныя парламентарыі таксама разгледзелі актуальныя напрамкі работы па супрацьдзеянні знешнім выклікам і пагрозам, санкцыйнаму ціску, прапагандзе нацызму. Акцэнт у абмеркаванні зроблены на пытаннях аховы гістарычнай памяці.

● Члены Савета Рэспублікі Віктар Лісковіч, Каліна Капуцкая, Ірына Сачкоўская, Алег Раманаў і Эльвіра Сарока прынялі ўдзел у чацвёртым з'ездзе рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь». На пасяджэнні былі падведзены вынікі работы за мінулую пяцігодку, вызначаны задачы на наступны перыяд, прынята новая рэдакцыя Праграмы грамадскага аб'яднання і выбраны кіруючыя органы — Рэспубліканскі савет і Цэнтральная кантрольна-рэвізійная камісія. На з'ездзе старшынёй рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» абраны Алег Раманаў.

● Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў прыняў удзел у пленарным пасяджэнні міжнароднай парламенцкай канферэнцыі «Гістарычная памяць: Вялікая Перамога, здабытая адзінствам». У мерапрыемстве ўдзельнічалі вышэйшыя службовыя асобы, парламентарыі, вучоныя, кіраўнікі арганізацый і прадпрыемстваў, а таксама запрошаныя госці з Расійскай Федэрацыі, Казахстана, Арменіі, Таджыкістана, Узбекістана, прадстаўнікі міждзяржаўных структур.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# НАСУСТРАЧ БУДУЧЫНІ

## З якімі думкамі едуць на Цягніку Памяці




## ШАНАВАЦЬ МАЛУЮ РАДЗІМУ, ВЫВУЧАЦЬ ГІСТОРЫЮ КРАІНЫ

**Канстанцін Шульжык жыве ў вёсцы Амелянец Камянецкага раёна. Сёлета ён скончыў 10 клас. Юнак вельмі сур'ёзна ставіцца да вучобы, сваімі профільнымі прадметамі лічыць матэматыку і фізіку, у будучыні плануе набыць тэхнічную спецыяльнасць і разам з тым з задавальненнем вывучае гуманітарныя дысцыпліны.**

— Год таму нашу школу ў Амелянцы закрылі, вучні сталі ездзіць у Пагранічную, за 18 кіламетраў, — расказвае Косця. — У новай школе мне вельмі спадабалася, як працуюць настаўнікі: яны ўмеюць падказаць, накіраваць, раскрыць і развіць здольнасці. У нас цудоўны настаўнік гісторыі Вячаслаў Уладзіміравіч Ваўранюк. Яго ўрокі праходзяць на адным дыханні. У пачатку навучальнага года мне прапанавалі напісаць конкурсную творчую работу на тэму «Ведай сваю Канстытуцыю». І зусім нечакана для сябе я стаў пераможцам у конкурсе. Пісаў як разумеў.



Акцэнт зрабіў на двух кірунках: інавацыі, без якіх немагчымы прагрэс у эканоміцы і грамадстве, і стаўленне да старэйшага пакалення. У нашай вёсцы пражывае каля 300 чалавек. З іх добрая траціна — людзі сталага ўзросту, многія даволі старыя. Гэтыя людзі ўсё жыццё прысвяцілі нялёгкай калгаснай працы. Лічу, што яны заслужылі большай увагі грамадства, чым маюць: і ў плане абслугоўвання, памеру пенсій, а таксама пашаны ад маладога пакалення. Лічу гэта заданнямі нам на будучыню. Наогул, я вельмі люблю сваю малую радзіму і яе людзей.

Дарэчы, як пераможца названага конкурсу Канстанцін Шульжык удзельнічаў у сустрэчы з Наталляй Качанавай 23 лютага, пабываў у Савеце Рэспублікі і Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Уражаннямі потым дзяліўся са школьнымі таварышамі.

І хоць Косця марыць паступіць у ВНУ тэхнічнага профілю, гісторыяй сваёй краіны цікавіцца даўно. Ён таксама актывіст валанцёрскага руху, член школьнай каманды «Што? Дзе? Калі?», якая летась заняла першае месца ў раёне. Калі даведаўся, што стаў удзельнікам патрыятычнай акцыі «Цягнік Памяці», вельмі ўзрадаваўся. Ад паездкі чакае новых цікавых знаёмстваў, сустрэч, уражанняў. Сказаў, што асабліва чакае экскурсійную праграму, цікава пабываць у памятных гістарычных месцах. Акрамя таго, спадзяецца пазнаёміцца з многімі равеснікамі, знайсці аднадумцаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, Камянецкі раён.**

## «Цікава будзе пабачыць розныя гарады і знайсці новых сяброў»

**Вучань магілёўскай СШ № 18 Максім ЛЯНЧЭЎСКІ свой 16-ы дзень нараджэння адзначыць у дарозе. 22 чэрвеня ён адправіцца з Брэста ў падарожжа на Цягніку Памяці па гарадах Беларусі і Расіі разам са сваімі аднагодкамі з дзвюх краін.**



— Калі патэлефанавалі са школы і прапанавалі ўдзельнічаць у гэтым праекце, я адразу ж пагадзіўся, — расказвае Максім. — Мне падалося цікавым праехацца на цягніку па Беларусі і Расіі і паглядзець нашы і расійскія гарады. Асабліва Санкт-Пецярбург. Кажуць, што там зараз белыя ночы і яны вельмі прыгожыя. Наогул, у Расіі быў толькі раз, ездзіў з сябрамі ў Пушкінскія горы. Але гэта не тое. Тут вялікая двухтыднёвая праграма, я нават не ўсю яе яшчэ вывучыў. Вельмі зацікавіла таксама рэканструкцыя першага бою Вялікай Айчыннай вайны ў Брэсцкай крэпасці.

Максім спадзяецца, што ў дарозе атрымаецца знайсці і новых сяброў. У цягніку будзе сто чалавек з Беларусі і сто з Расіі. Дарэчы, дзень нараджэння Максім упершыню будзе адзначаць удалечыні ад родных і блізкіх. Прызнаецца, што гэта яго не засмучае, хутчэй наадварот. З бацькамі і сябрамі можна і потым адзначыць, а тут нешта новае, нестандартнае. І гэта павінна быць цікава. Тым больш што адзначаць яго ён будзе нават не ў Беларусі, а ў суседняй краіне.

— Мы ў чаце ўжо абмяркоўвалі гэта пытанне, — прызнаецца ён. — Я ведаю ўсіх, хто паедзе з Магілёўскай вобласці, лічы, ужо завочна пасябравалі. Ведаю, хто чым займаецца, што з сабой браць у паездку. Асабліва нічога там і не спатрэбіцца. У цягніку, кажуць, усё будзе, нават настольныя гульні. З асабістага бяру толькі тэлефон і навушнікі.

Суразмоўца прызнаецца, што ў будучыні марыць стаць праграмістам, распрацаваць свой софт, не выключае, што зможа ствараць навучальныя гульні для школьнікаў. Яго любімыя прадметы — інфарматыка, фізіка, матэматыка. Ён пераможца конкурсаў і алімпіяд па біялогіі, экалогіі, фізіцы, інфарматыцы. Удзельнічаў у навукова-даследчых работах па фізіцы і біялогіі, летась яго работа па біяэкалогіі заняла першае месца ў краіне.

— Спачатку яна задумвалася як эксперымент у рамках фізікі, — расказвае Максім. — Але гэта вынаходніцтва можна прымяняць у сферы біялогіі і экалогіі. Разам з настаўнікам сабралі танны і просты ў выкарыстанні прыбор з датчыкам вуглякіслага газу. З дапамогай гэтага прыстасавання можна кантраляваць якасць паветра ў месцах, дзе вельмі шмат людзей, або для стварэння аптымальных умоў для раслін.

Максім прызнаецца, што гэта падарожжа будзе самае незвычайнае і самае вялікае. І нават тое, што прыйдзецца столькі дзён правесці ў дарозе, не напружвае. Гэта ж цікава. Дні падчас такіх мерапрыемстваў бягуць непрыкметна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## «Унутраны патрыёт у такія моманты гаворыць: «Гэта сапраўды крута!»

**Вучань 11 класа Рэчыцкай сярэдняй школы № 7 Дзмітрый КАРОБАЧКА — прызёр рэспубліканскага конкурсу «Патрыёт. by», пераможца раённага этапа конкурсу «Лідар года» і рэспубліканскага злёту «Лагер бяспекі». Дзмітрый — камандзір школьнай каманды юных ратавальнікаў-пажарных «Багор»: дапамагае раскрыць талент пачынаючых байцоў маладзёжнага руху бяспекі, натхняе на новыя рэкорды ў спаборніцтвах.**




— У вучняў маёй школы да дзейнасці Беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі ратавальнікаў-пажарных вялікая цікавасць. У школьным аб'яднанні па інтарэсах сабралі каманду. Рыхтуемся і выступаем на абласных і рэспубліканскіх спаборніцтвах. Сёлета сталі прызёрамі абласнога злёту-конкурсу: у баявым разгортванні паказалі лепшыя вынікі, паставілі рэкорды ў выкананні гэтага нарматыву спаборніцтва. Я даўно вызначыўся са сваёй будучай прафесіяй. Вучуся ў фізіка-матэматычным класе, але значную ўвагу ўдзяляю фізічнай падрыхтоўцы, трэніроўкам, бо мару стаць студэнтам Універсітэта грамадзянскай абароны МНС Беларусі. Зацікаўленасць праблемамі бяспекі яшчэ ў малодшых класах далі ўпэўненасць у сабе, магчымасць пераадолець боязь выступленняў, выхавала мяне як сённяшняга камандзіра каманды. Тады я ў вобразе «Флікера» ў гульнявой форме расказваў на мерапрыемствах аб правілах паводзін на дарозе. Выступіць у такім перфомансе бяспекі мяне сталі запрашаць па ўсім горадзе. Сёння я перакананы, што патрыёт краіны не толькі ведае і шануе гісторыю свайго народа, любіць малую радзіму, але і любіць сваіх землякоў, гатовы прыйсці ім на дапамогу ў самыя цяжкія хвіліны.

Як у юнака з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй цікаўлюся ў Дзмітрыя, які, на яго погляд, патрыятычны праект асабліва зацікавіць падлеткаў, маладых людзей?

— Вядома, сёння моладзі цікава ўсё, што звязана з камп'ютарнымі тэхналогіямі. Таму патрыятычны праект, лічу, павінен быць у выглядзе мабільнага дадатку. Праз гульнявыя элементы, магчыма, квэсты, ён будзе расказваць пра важныя гістарычныя вехі нашай краіны. Праз віртуальную рэальнасць цікава было б аднавіць, што ў тваім родным населеным пункце, раёне адбывалася ў час Вялікай Айчыннай вайны, ці іншы адметны гістарычны прамежак часу. Такі мабільны патрыятычны праект можна выкарыстоўваць і на занятках у школе. Асабліва важна, каб мабільны дадатак аб гісторыі для моладзі гарантаваў дакладныя правераныя факты і звесткі. Так, нас вучаць крытычнаму пошуку інфармацыі ў сецыве і рабоце з ёй. Але са свайго прыкладу магу сказаць, што амаль штодзень у сацыяльных сетках ствараюцца быццам групы па інтарэсах для падлеткаў, маладых людзей, якія падаюць інфармацыю аб гістарычных падзеях не толькі некарэктную, але і супярэчлівую, хлуслівую.

Такія праекты, як «Цягнік Памяці», упэўнены вучань з Рэчыцы, — захапляльны патрыятычны маладзёжны квэст, пазнавальны, эмацыянальна насычаны, які гарантуе жывыя зносіны і магчымасць знайсці сяброў, пабываць там, дзе нават і не марыў.

— Да пандэміі я двойчы ў складзе беларускай дэлегацыі актывістаў БРСМ браў удзел у летнім лагеры для маладзёжных клубаў аб'яднанага цэнтра «Маналіт» у Курскай вобласці. Сёлета зноў атрымаў запрашэнне. Дакладна магу сказаць, што вопыт міжнароднага сяброўства неацэнны. Калі ў міжнародным лагеры мы прадстаўлялі нашу дэлегацыю, выклікалі фурор. Падрыхтавалі як інфармацыйныя, так і забаўляльныя мерапрыемствы толькі на беларускай мове. Дык вось, увесь час самым частым запытам удзельнікаў маладзёжных клубаў было паразмаўляць, навучыць іх нашай мове, расказваць аб гісторыі краіны па-беларуску. Унутраны патрыёт у такія моманты гаворыць: «Гэта сапраўды крута!»

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# І ГЕРАІЧНАМУ МІНУЛАМУ

## беларускія ўдзельнікі праекта

### «Імкнецца ва ўсім зразумець сутнасць»

**СТАНІСЛАЎ ВОНСІК скончыў 10 клас у школе № 2 гарадскога пасёлка Бешанковічы, што на Віцебшчыне. Дарэчы, школа гэта носіць імя Героя Савецкага Саюза Міхаіла Мікалаевіча Ткачэнкі, легендарнага лётчыка родам з Бешанковічаў.**

— Стас вучыцца ў нас толькі з першага верасня, а да гэтага — у Спецыялізаваным ліцэі МУС у Мінску, — расказала пра свайго вучня класны кіраўнік 10 класа Ірына Голубева. — І для мяне было дзіўна, наколькі хутка ён пасябраваў з аднакласнікамі і ўліўся ў новы калектыў. Стас абраў профільны клас, дзе на павышаным узроўні вывучаецца біялогія і хімія. І адразу праявіў сябе — перамог у другім этапе рэспубліканскай прадметнай алімпіяды па хіміі. Увогуле, вельмі адказны як у плане вучобы, так і ў плане нейкіх школьных даручэнняў. Нават пасля хваробы прыходзіў падрыхтаваным да ўрокаў. Спакойны, вытрыманы, з павагай і тактам ставіцца да ўсіх аднакласнікаў і настаўнікаў. Дарэчы, Стас перамог у раённым і ўдзельнічаў у абласным этапе інтэлектуальнага шоу «Я ведаю!». Удзельнічаў у раённым турніры па гісторыі роднага краю «Вялікая Айчынная вайна ў гісторыі маёй малой радзімы». Наведвае факультатывы, яго адразу вылучыў наш настаўнік па дапрызыўнай падрыхтоўцы юнакоў Аляксандр Сяргеевіч Падольскі. Нездарма Стас некалькі гадоў правучыўся ў ліцэі МУС.

Што да будучыні, Станіслаў пакуль у пошуку, кажа Ірына Васільеўна. «Калі мы здавалі рэпетыцыйнае тэсціраванне, ён абраў прадметаў больш за іншых, бо яшчэ не вырашыў, куды будзе паступаць, але спадзяецца за лета вызначыцца. У яго выбар: здаваць матэматыку з хіміяй, гэта значыць хіміка-тэхналагічны профіль, альбо матэматыку з фізікай», — дадала педагог і прызналася: вельмі ганарыцца тым, што яе вучань трапіў у праект «Цягнік Памяці».

У Стаса ёсць старшыя і малодшыя браты і сёстры, расказаў яго бацька Іван Уладзіміравіч.



«Хлопец імкнецца ва ўсім зразумець сутнасць, — ахарактарызаваў ён сына. — Разважлівы. Думаю, яму пашанцавала з настаўнікамі. Школа ў Бешанковічах вельмі добра працуе з дзецьмі. Сын і сам імкнецца да развіцця, і педагогі гэта заўважаюць і падштурхоўваюць яго. Менавіта тут ён захапіўся гісторыяй. У ліцэі, дарэчы, таксама быў выдатнікам».

«Важна ведаць гісторыю не толькі малой радзімы, але і краіны ў цэлым, — працытавалі Станіслава «Витебские вести». — Што датычыцца Бешанковіцкага раёна, калі зазірнуць углыб гісторыі, то можна знайсці важны факт: у ліпені 1812 года на працягу трох дзён пад Астроўнам ішлі бязлітасныя баі 1-й Рускай арміі Барклая-дэ-Толі, якая адступала, з французскай арміяй. Сваімі ведамі аб гістарычным мінулым Віцебшчыны абавязкова падзялюся з удзельнікамі праекта «Цягнік Памяці». Павінны быць моцныя сувязі паміж беларускай і расійскай моладдзю, бо славянскія народы аб'ядноўвае вялізнае трагічнае мінулае, у тым ліку самая кровапралітная ў гісторыі чалавецтва вайна — Вялікая Айчынная».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

### «Для мяне гэта вялікі гонар і давер»

**ЯНА САПОЦКАЯ закончыла 10 клас Слуцкай сярэдняй школы № 8. Як кажуць, таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім. Дзяўчына выдатна вучыцца. Яна пераможца раённага конкурсу «Вучань года», творчых абласных і рэспубліканскіх конкурсаў, удзельніца ўзорнага ансамбля танца «Папараць-кветка», наведвае факультатыўныя заняткі музычнага кірунку на базе сваёй школы, актыўна займаецца спортам. Дзяўчына віртуозна іграе на фартэпіяна, танцуе, пяе, выконвае сольныя нумары. Нездарма яе кандыдатуру калектыў ансамбля прапанаваў для ўдзелу ў патрыятычным праекце «Цягнік Памяці».**



— Для мяне гэта вялікі гонар і давер з боку кіраўніка, харэографа нашага музычнага ансамбля Ірыны Віктараўны Лаўровай, сяброў, — кажа Яна. — Вядома, крыху хваююся: як успрымуць мяне ў новым калектыве, як буду наладжваць кантакт з равеснікамі. Цікава будзе пазнаёміцца з беларускімі, расійскімі хлопцамі і дзяўчатамі, наведаць расійскія гарады, даведацца пра іх гісторыю. Праграма мерапрыемства вельмі разнастайная і насычаная: экскурсіі, сустрэчы з цікавымі людзьмі. Мяркую, гэтае падарожжа значна пашырыць мой кругагляд, абагаціць новымі ведамі, знаёмствамі. Акрамя таго, дасць магчымасць больш даведацца аб трагічных старонках Вялікай Айчыннай вайны, подзвігу нашых продкаў. Мой прадзед Міхаіл Арсеньевіч Міхневіч удзельнічаў у ваенных падзеях, узнагароджаны ордэнам Вялікай Айчыннай вайны І ступені, медалямі «За адвагу», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў». У нашай сям'і захоўваюць яго фатаграфію, берагуць памяць аб родным чалавеку.

— А якія школьныя прадметы ты найбольш любіш? — пацікавілася ў Яны.

— Я больш схільная да засваення моў — беларускай, рускай, англійскай. Магчыма, буду паступаць у лінгвістычны ўніверсітэт.

Удалося мне датэлефанавацца і да маці Яны Сапоцкай.

— У нас з мужам дзве дачушкі. Мы вельмі ганарымся сваімі дзяўчынкамі: разумніцы, прыгажуні, актывісткі. Старэйшая вучыцца ва ўніверсітэце культуры, таленавітая, з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, узначальвае пярвічную прафсаюзную арганізацыю ўстановы адукацыі. Малодшая, як бачыце, таксама не адстае, — расказала Святлана Іванаўна.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**



### «Хочацца больш даведацца аб значных падзеях у канкрэтных гарадах»

**МЫ сустрэліся з Кірылам АБЛАЖЭВІЧАМ, 10-класнікам СШ № 16 горада Гродна літаральна напярэдадні гэтага незвычайнага падарожжа. Пакуль ён яшчэ не вельмі дакладна ўяўляе сабе гэту паездку, але маральна да яе гатовы. Разлічвае сабраць як мага больш інфармацыі аб маршруце, каб пасля расказаць аб ім у класе, на пасяджэнні Маладзёжнага парламента і проста ў сямейным коле.**



Кірыл у ліку 200 беларускіх і расійскіх вучняў прымае ўдзел у міжнародным праекце «Цягнік Памяці». Расказаў, што быў вельмі ўзрушаны, калі ў школе яму паведамілі аб гэтым. Прызнаўся: стала няёмка, што абралі менавіта яго. Было відаць, што хлопец не вельмі любіць расказваць аб сваіх дасягненнях. А іх аказалася не так і мала. Бо менавіта яго актыўная грамадская пазіцыя, ініцыятыўнасць і чыста чалавечая прыстойнасць далі падставу для ўдзелу ў праекце.

— Мяне цікавяць падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Наша школа носіць імя Героя Савецкага Саюза казаха Агадзіла Сухамбаева. Ён загінуў летам 1944 года пры вызваленні Гродна, паўтарыўшы подзвіг Аляксандра Матросава. У маёй сям'і таксама былі ўдзельнікі вайны, гэта мой стрыечны прадзед, які загінуў пры вызваленні Польшчы. Магчыма, у будучыні таксама стану ваенным. Зараз прымаю ўдзел у роце ганаровай варты. Мы нясём Вахту памяці каля Вечнага агню і брацкай магілы ў гарадскім парку. Нам выдаецца спецыяльная форма, і гэта вельмі хвалюючa. За тыя хвіліны, што стаіш каля помніка, заўсёды ўяўляеш нейкія ваенныя падзеі: ці то з фільмаў, ці то з расповедаў ветэранаў. Думаю, што падчас паездкі змагу даведацца шмат новага аб тых, хто здабываў для нас будучыню, — запэўніў Кірыл.

Хлопец лічыць, што і ў сучасным жыцці таксама можна сябе праявіць дастойнымі ўчынкамі, нават у школьныя гады. Ён камандзір валанцёрскага атрада «Падорым дабро», дэпутат Маладзёжнага парламента пры Гродзенскім абласным Савеце дэпутатаў, актывіст БРСМ. За сваю грамадскую дзейнасць узнагароджаны дыпломамі, пераможца абласных і рэспубліканскіх конкурсаў. А яшчэ Кірыл не баіцца ніякай працы. Умее і дровы секчы, і траву касіць. Ён надзейны памочнік дзядулі і бабулі, якія жывуць у Астравецкім раёне. Аказалася, што яны шматгадовыя падпісчыкі газеты «Звязда» і, вядома, будуць вельмі рады прачытаць пра ўнука ў сваім любімым выданні.

Дарэчы, паездка ўзрушыла не толькі Кірыла, але і ўсю сям'ю. Маці Марына Іванаўна нават паспела пазнаёміцца з насычанай праграмай. Яна лічыць, што падрыхтоўка і арганізацыя паездкі вядуцца на высокім узроўні. Графік вельмі шчыльны: экскурсіі, музеі, сустрэчы, канцэрты, магчымасць абмяняцца думкамі і знайсці новых сяброў. Яна перакананa: праект «Цягнік Памяці» дазволіць нагадаць знакавыя падзеі і даты мінулага, каб маладое пакаленне цаніла мір, свабоду сваёй краіны, ганарылася гераізмам народа. Яна ўпэўнена, што паездка будзе незабыўнай, пазнавальнай і прыемнай для ўсіх яе ўдзельнікаў.

Кірыл з жартам прыгадаў, што маці наказала яму дакладваць свае ўражанні, усё тое, што адбываецца на шляху, і падмацоўваць фотаздымкамі. Ён упэўнены, што родныя будуць і самі сачыць праз сродкі масавай інфармацыі за маршрутам цягніка.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ПРАЦОЎНЫ КВЭСТ ДЛЯ ШКОЛЬНІКАЎ

## Як вясковыя падлеткі вучацца шанаваць чалавека працы

**Весела правесці час на летніх канікулах і зарабіць пасільнай працай першыя грошы. На Гомельшчыне другасная летняя занятасць сёлета на піку папулярнасці ў вясковых старшакласнікаў. У Гомельскім раёне 370 школьнікаў праявілі жаданне папрацаваць летам. Раённыя ўлады пайшлі насустрач падлеткам і амаль удвая павялічылі колькасць лагераў працы і адпачынку. Амаль удвая ўзрасла і колькасць сельскіх вучняў — удзельнікаў студатрадаў БРСМ.**



### Працоўныя канікулы

Лагеры працы і адпачынку ў асноўным адкрыты пры ўстановах адукацыі. Арганізаваць такую форму карыснай занятасці школам дапамаглі аддзел адукацыі і ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага райвыканкама. Але ёсць сёлета і лагеры працы і адпачынку, адкрытыя пры падтрымцы арганізацый раёна, гатовых працаўладкаваць непаўналетніх на летні перыяд. Школы для арганізацыі працоўнай занятасці вучняў у тым ліку могуць заключаць прамыя дагаворы з прадпрыемствамі. На тэрыторыі раёна 11 арганізацый, якія ў летні перыяд могуць з улікам умоў прадставіць працу непаўналетнім. У асноўным гэта сельскагаспадарчыя прадпрыемствы.



**За работай вучаніцы Урыцкай сярэдняй школы Хрысціна ЯДЧАНКА і Данііла СЕРГЕЕНКА.**

— Такую сацыяльна значную ініцыятыву нашых прадпрыемстваў мы, безумоўна, падтрымліваем, — падкрэсліла **старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА.** — Матывуем нашых гаспадарнікаў падтрымліваць школы ў імкненні далучаць дзяцей да працы. Да таго ж гэта сапраўды запатрабавана ў жыхароў населеных пунктаў раёна. Дзеці разумеюць, як гэта — сваёй працай зарабіць грошы. Для дарослага працоўнага чалавека, можа, гэтыя сумы нязначныя, але для дзяцей — добры стымул, матывацыя. Яны дазнаюцца, што такое праца, як яна можа ацэньвацца, пачынаюць і больш шанаваць чалавека працы.

Да таго ж перакананыя ў раёне, лагеры працы і адпачынку, студатрады — важная прафарыентацыйная падрыхтоўка, асабліва для старшакласнікаў.

**Начальнік аддзела адукацыі Гомельскага райвыканкама Алена КАВАЛЁВА** адзначае высокую папулярнасць такой формы арганізацыі летняга вольнага часу і ў дзяцей, і ў іх бацькоў. Так, калі летась у раёне лагерамі працы і адпачынку было ахоплена 69 вучняў, у гэтым — 120, 60 школьнікаў атрымалі магчымасць папрацаваць і карысна адпачыць дзякуючы індывідуальным дагаворам, заключаным паміж установамі адукацыі і прадпрыемствамі.

Калі гаварыць аб другаснай занятасці вучняў пры падтрымцы ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, то гэта пашыў бялізны, рамонт школьнага інвентару, работа ў школьнай бібліятэцы. Усё залежыць ад праекта, які з удзелам дзяцей рэалізоўвае школа.

— Праекты на летні перыяд установы складаюць у пачатку навучальнага года. Пасля праходзіць узгадненне ў райвыканкаме і ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Пад канкрэтныя праекты адпаведна выдзяляецца фінансаванне. Заробак у лагеры працы і адпачынку залежыць ад аб'ёму работ, якія будуць выконваць школьнікі зыходзячы з праекта, — у тонкасці механізму арганізацыі другаснай занятасці пры школах пасвячае **начальнік аддзела ДУ «Гомельскі раённы навучальна-метадычны кабінет» Ганна АХОТНІКАВА** і дадае:

— Ёсць невялікія праекты, але нашы школы за іх усё роўна бяруцца, таму што не ўсе знаходзяцца блізка ад прадпрыемстваў, якія прадстаўляюць працу навучэнцам, а ахвотных вельмі шмат. Школы імкнуцца на летнія месяцы пакінуць самыя ёмістыя па аб'ёме праекты, каб дзеці фінансава адчулі стымул.

Сёлета многія школы працягнулі такую схему карыснай занятасці, калі вучні могуць папрацаваць і адпачыць у лагеры працы і адпачынку, а потым яшчэ і працаўладкавацца праз прадпрыемства ці праз БРСМ. Летась пры такой занятасці за месяц працы дзеці зараблялі да 200 рублёў.

### Кастынг ахвотных працаваць

Зябраўская і Клімаўская сярэднія школы для арганізацыі лагераў працы і адпачынку сёлета заключылі дагавор з Каранёўскай эксперыментальнай лясной базай Інстытута лесу НАН Беларусі. У школах настолькі шмат ахвотных папрацаваць, што для ўдзелу ў летніках праводзяць адбор. Змена ў такім лагеры для мясцовых школьнікаў — форма заахвочвання, узнагарода.

— Лагер працы і адпачынку для нашых дзяцей доўжыцца 18 дзён. Падлеткі, вядома, жывуць у сучасным свеце і самі гавораць, што ў такой занятасці бачаць рэальныя грошы, якія могуць самі зарабіць, — настрой сваіх працавітых вучняў перадае **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Зябраўскай сярэдняй школы Вераніка НЯМКОВА.** — Бацькі гэтую ініцыятыву старанна падтрымліваюць, бо ў тым ліку, што не менш важна, у лагеры працы і адпачынку дзеці забяспечаны трохразовым харчаваннем: сняданак, абед і падвячорак. Працуюць нашы вучні з 9 да 13 гадзін, з неабходнымі перапынкамі: працоўнымі дагаворамі прадугледжаны пэўны рэжым працы, дапушчальны для непаўналетніх.

> «Дзеці разумеюць, як гэта — сваёй працай зарабіць грошы. Для дарослага працоўнага чалавека, можа, гэтыя сумы нязначныя, але для дзяцей — добры стымул, матывацыя. Яны дазнаюцца, што такое праца, як яна можа ацэньвацца, пачынаюць і больш шанаваць чалавека працы.

Пасля працы — абед. Затым — гульні ў спартзале. Прапануюць таксама экскурсіі, культурна-масавыя мерапрыемствы, квэсты.

У школьнікаў Зябраўскай сярэдняй школы, якім не хапіла месца ў лагерах працы і адпачынку, пры падтрымцы раённай арганізацыі БРСМ вырашыла сфарміраваць студэнцкія атрады. Сёлета іх будзе два: папрацаваць змогуць зноў жа ў Каранёўскай эксперыментальнай лясной базе Інстытута лесу НАН Беларусі і на прадпрыемстве ААТ «Птушкафабрыка «Світанак».



**Настасся ГЛУМАВА і Дар'я ПАБЯДЗЕНКА ў лагеры працы і адпачынку выконваюць заказ па пашыве бялізны для групы прадоўжанага дня.**

### Сабраць «на мора»

На тэрыторыі адной з самых буйных устаноў адукацыі раёна — Урыцкай сярэдняй школы — на працягу амаль трох тыдняў паспяхова працуе лагер працы і адпачынку «Рытм». Яго ўдзельніцы — дзесяць выпускніц восьмага класа.

— Мне падабаецца наведваць лагер, таму што сюды ходзяць многія мае сяброўкі. Мы разам і працуем, і адпачываем, — прызнаецца вучаніца Урыцкай сярэдняй школы Настасся Глумава.

Сяброўкі, а цяпер яшчэ і калегі па працы, дадаюць, з плюсаў — магчымасць бясплатна асвоіць прафесію швачкі, правесці час з карысцю ў добрай кампаніі, да таго ж і зарабіць грошы. За ўвесь перыяд дзяўчаты зарабляюць у сярэднім 70 рублёў.

— Мы з бацькамі плануем паехаць адпачываць. Мне будзе прыемна ўнесці свой матэрыяльны ўклад, — гаворыць аб сваёй матывацыі папрацаваць Настасся Глумава.

**Намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Урыцкай сярэдняй школы Вольга ЛАПІЦКАЯ** расказвае, што такі від канікулярнай занятасці ў іх школе папулярны ўжо некалькі гадоў:

— Сёлета нашай школе ўпраўленнем па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама было вылучана толькі 10 вакансій, хоць ахвотных было значна больш. Безумоўна, удзельніцы лагера працы і адпачынку павінны былі прайсці адбор па стане здароўя. Куратар дзяўчат — настаўніца працоўнага навучання Алена Картузава. Пад яе наглядам нашы вучаніцы шыюць пасцельную бялізну для навучэнцаў групы прадоўжанага дня. Мы вырашылі, што калі дзяўчаты скончаць работу над наборамі бялізны, то самі перададуць іх малодшым школьнікам, раскажуць, як папрацавалі сёлета ў школе на агульную карысць.

Намеснік дырэктара адзначыла, што сёлета, дзякуючы супрацоўніцтву з раённай арганізацыяй БРСМ, урыцкія школьнікі актыўна працуюць у якасці байцоў студатрадаў.

— Са сваіх назіранняў за вучнямі, якія бралі ўдзел у студатрадзе або ў лагеры працы і адпачынку, магу цвёрда сказаць: такі вопыт падлеткаў разнавольвае, гарантуе ўпэўненасць у сабе. Новых сяброў, цікавыя захапленні знаходзяць нават тыя, хто быў адзіночкам. Дзеці добра навучаюцца камунікаваць, — падзялілася педагог.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 21 чэрвеня 2022 года.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора, директора ООО «Правовая Стратегия» (220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1404, п/я 34) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущество КУП «Червенский деревообрабатывающий комбинат» (223232, Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71) в составе:

**недвижимое имущество:**

**лесопильный цех, инв. № 615/С-15978, общей площадью 463,0 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625850100001003967 площадью 0,6739 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71;**

**компрессорная, инв. № 615/С-16032, общей площадью 62,2 кв. м;**

**трансформаторная подстанция № 2, инв. № 615/С-16033, общей площадью 13,6 кв. м;**

**склад, инв. № 615/С-15977, общей площадью 403,8 кв. м;**

**котельная** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки)*, **инв. № 615/С-15983, общей площадью 504,5 кв. м;**

**ремонтный цех** *(составные части и принадлежности: подвал, мастерская, сарай)*, **инв. № 615/С-16275, общей площадью 549,1 кв. м;**

**здание цеха** *(составные части и принадлежности: 10 (десять) пристроек)*, **инв. № 615/С-16276, общей площадью 3531,5 кв. м;**

**трансформаторная подстанция № 1, инв. № 615/С-15979, общей площадью 42,3 кв. м.**

Часть объектов обременена договорами аренды, сведения о которых можно получить у организатора торгов.

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 625850100001003966 площадью 1,9011 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона газораспределительной системы, пл. 0,0096 га.*

**Оборудование:**

**трансформатор силовой ТМГ-400/10/0,4, инв. № 111, заводской № 1149360;**

**ленточнопильный станок МВ-2000, инв. № 99-8;**

**приспособление для заточки ленточных пил ПЗП-10.00.000;**

**приспособление для разводки ленточных пил ПРП-11.00.000;**

**рама лесопильная Р63-4Б, инв. № 120.**

**Оборудование расположено по адресу: Минская область, г. Червень, ул. Минская, 71.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **371 373,80** бел. руб. *Начальная цена снижена на 51 %.* Задаток 10 % от начальной цены – **37 137,38** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Шаг аукциона – 5 %.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов **www.rlt.by**.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель). Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 12.02.2022, 22.03.2022, 16.04.2022, 07.05.2022.

Аукцион состоится **05.07.2022 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.07.2022** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320. Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефон для осмотра 029 335 74 49.**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## Извещение о проведении электронных торгов

<table>
<tr><td>Организатор аукциона</td><td>ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5</td></tr>
<tr><td>Продавец</td><td>ОАО «Ивацевичдрев», Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2</td></tr>
<tr><td>Оператор ЭТП</td><td>ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б</td></tr>
<tr><td>Адрес ЭТП</td><td>www.ipmtorgi.by</td></tr>
<tr><td colspan="2">Предмет электронных торгов – спецтехника, бывшая в употреблении. Местонахождение: Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Заводская, 4</td></tr>
</table>

| Номер лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Грузовой специальный сортиментовоз (с гидроманипулятором) MAZ 6303A8, рег. знак AM 4694-1,** 2017 г. в. | 92 902,66 |
| 2 | **Грузовой специальный сортиментовоз (с гидроманипулятором) MAZ 6303A8-1328, рег. знак AM 6832-1,** 2018 г. в. | 94 615,89 |
| 3 | **Прицеп специальный сортиментовоз MAZ 837810-022, рег. знак A 6497 E-1,** 2017 г. в. | 10 5280,03 |

<table>
<tr><td colspan="2">Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»</td></tr>
<tr><td colspan="2">Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней после проведения торгов</td></tr>
<tr><td colspan="2">Условия оплаты предмета электронных торгов</td></tr>
<tr><td colspan="2">Предмет аукциона должен быть оплачен покупателем (претендентом на покупку) в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи</td></tr>
<tr><td colspan="2">Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by</td></tr>
<tr><td colspan="2">Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов</td></tr>
<tr><td>Дата и время начала и окончания электронных торгов</td><td>Начало торгов – 25.07.2022 в 11.00.<br>Окончание торгов – 25.07.2022 в 12.00.<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов</td></tr>
<tr><td>Дата и время окончания приема заявок</td><td>Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 22.07.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by</td></tr>
<tr><td colspan="2">Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.<br>E-mail: auction@cpo.by</td></tr>
</table>

В извещении, опубликованном в газете **«Звязда» от 18.06.2022 г.**, по продаже имущества ОАО «Быховский консервно-овощесушильный завод» (УНП 700183696) ДОПУЩЕНА ОШИБКА. Правильным считать: **начальная цена предмета торгов указана в бел. руб. без НДС. Реализация имущества осуществляется с учетом прибавления НДС по ставке 20 %.** Остальные условия без изменений.

УНП 191113330

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 25 июля 2022 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

<table>
<tr><th>№ лота</th><th>Наименование предметов торгов</th><th>Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.</th><th>Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.</th></tr>
<tr><td colspan="4">Условие продажи: 1. Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. 2. Действия по снятию с регистрационного учета транспортного средства (лот № 12) (автотехники и механизмов), а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производятся Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. 3. После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельного участка (лоты №№ 1, 2, 3), необходимого для обслуживания предмета аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка возлагаются на Покупателя (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продажи прилагается). Информация о земельном участке: лоты №№ 1, 2, 3: кадастровый номер 340800000003000135 общей площадью 17,5820 га – для обслуживания зданий и сооружений меховой фабрики (право аренды доля ОАО «БЕЛФА», г. Жлобин, 241/250) . Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1</td></tr>
<tr><td>1</td><td>Изолированное помещение с инв. № 320/D-34608 площадью 3020,3 кв. м, назначение – складское помещение, наименование – изолированное помещение № 4. Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-4</td><td>597 600,00</td><td>59 760,00</td></tr>
<tr><td>2</td><td>Изолированное помещение с инв. № 320/D-34609 площадью 894,4 кв. м, назначение – складское помещение, наименование – изолированное помещение № 5. Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-5</td><td>187 200,00</td><td>18 720,00</td></tr>
<tr><td>3</td><td>Изолированное помещение с инв. № 320/D-34610 площадью 1 241,2 кв. м, назначение – складское помещение, наименование – изолированное помещение № 6. Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-6</td><td>235 200,00</td><td>23 520,00</td></tr>
<tr><td>4</td><td>Двухпрочесная кардочесальная машина SHP-24A № 1 (инв. № 142-04876-1)</td><td>19 080,00</td><td>1 908,00</td></tr>
<tr><td>5</td><td>Передвижная раскройная машина CS-532/18-2 (инв. № 142-42901)</td><td>240,00</td><td>24,00</td></tr>
<tr><td>6</td><td>Раскройная ленточная машина OSHIMA OB-900A/c (инв. № 142-43058)</td><td>5 640,00</td><td>564,00</td></tr>
<tr><td>7</td><td>Заточной станок 3622Д (инв. № 142-41093)</td><td>2 520,00</td><td>252,00</td></tr>
<tr><td>8</td><td>Токарно-винторезный станок ТС-75 (инв. № 142-42593)</td><td>3 240,00</td><td>324,00</td></tr>
<tr><td>9</td><td>Токарно-винторезный станок МК-6056 (инв. № 142-42579)</td><td>8 880,00</td><td>888,00</td></tr>
<tr><td>10</td><td>Сплит система холодильная (инв. № 230-3941)</td><td>1 200,00</td><td>120,00</td></tr>
<tr><td>11</td><td>Сплит система холодильная CB 216 SF (инв. № 230-3946)</td><td>1 440,00</td><td>144,00</td></tr>
<tr><td>12</td><td>Автомобиль ZAZ LANOS, 2010 г. в., рег. № 9533 ВТ-3 , цвет – темно-бордовый металлик, тип ТС – легковой седан, тип двигателя – бензиновый, № кузова (рамы) Y6DTF69Y090224536, объем 1,5 л МКПП</td><td>3 480,00</td><td>348,00</td></tr>
</table>

**Продавец:** ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин. 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (044) 797-88-07, заместитель директора по техническим вопросам – Галактионов Виктор Владимирович. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 22 июня 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 **прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 21 июля 2022 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи до **30 (тридцати) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Белгипроторг»

<table>
<tr><th>Лот</th><th colspan="2">Наименование</th><th>Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.</th><th>Задаток, бел. руб.</th><th>Шаг аукциона, бел. руб.</th></tr>
<tr><td>1</td><td colspan="2">Кап. строение с инв. № 350/С-105271 общей площадью 754,7 кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административное здание</td><td>933 840,00</td><td>93 384,00</td><td>46 692,00</td></tr>
<tr><td colspan="6">В отношении лота № 1 проводятся третьи повторные торги. Цена снижена на 40 %. Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 69 (29691) от 09.04.2022, 6 стр., № 95 (29717) от 18.05.2022, 15 стр., № 108 (29730) от 04.06.2022, 6 стр.</td></tr>
<tr><td colspan="6">Местонахождение лота № 1: 246050, Гомельская обл., г. Гомель, ул. Советская, 26А</td></tr>
<tr><td colspan="6">Лот № 1 расположен на земельных участках с кадастровыми номерами 340100000001000340 (площадью 0,0200 га), 340100000001007229 (площадью 0,0001 га), 340100000001007231 (площадью 0,0001 га), 340100000001007230 (площадью 0,0001 га), целевое назначение земельных участков – для эксплуатации здания Гомельских комплексных проектных мастерских</td></tr>
<tr><td colspan="2">Ограничения (обременения)</td><td colspan="4">Аренда помещений, расположенных на первом (86,30 кв. м), втором (141,85 кв. м) этажах до 30.10.2023 и на третьем (129,86 кв. м), четвертом (129,94 кв. м) этажах — до 29.11.2022.<br>Земельные участки с кадастровыми номерами 340100000001007229, 340100000001007231, 340100000001007230 имеют ограничения (обременения) на земельные участки, расположенные в зонах охраны недвижимых материальных историко-культурных ценностей, код – 6</td></tr>
<tr><td colspan="2">Дата и время проведения торгов</td><td colspan="4">4 июля 2022 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127</td></tr>
<tr><td colspan="2">Срок приема заявлений и внесения суммы задатка</td><td colspan="4">С 10.00 22 июня 2022 года до 16.00 1 июля 2022 года</td></tr>
</table>

**Условия для участия в торгах:** 1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по лоту 1, ОАО «Белгипроторг», проводимых 04.07.2022.

2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – по лоту № 1 – 4,5 % (четыре целых пять десятых процента) от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов. **Государственная регистрация договора купли-продажи и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.**

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте **https://orgtorg.by/info.**

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов **– Андрей, +375293042560.**

8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| Информация о продавце | ОАО «Белгипроторг» в лице ликвидатора – ООО «Партнер-Консультант», тел.: 80172552928; +375293489225. (220089 г. Минск, ул. Железнодорожная д. 31 корпус 1, комн. 307, УНП 100026596) |
| Организатор аукциона | ООО «Фрондера» 220113 г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: **info.torgi@orgtorg.by** • сайт **https://orgtorg.by** • telegram **https://t.me/orgtorg** |

# «РОДНЫ МІНСК Я ПАКІНУЎ, НЯМЕЦКАЙ БАМБЁЖКАЮ ГНАНЫ...»

## Пачатак вайны ў творах беларускіх пісьменнікаў

Для кожнай беларускай сям'і дзень 22 чэрвеня 1941 года стаў пачаткам трагедыі. Мая мама, хоць ёй у той дзень было ўсяго пяць, пакінула ў сваіх успамінах запіс: «Многае сцёрлася з памяці, але ёсць рэчы, якія не забываюцца. 22 чэрвеня пачалася вайна». Так сталася, што наша сям'я з Пухаўшчыны тады апынулася пад Ленінградам, дзе мая бабуля працавала на чыгунцы, і мама ўспамінала: *«Гул самалётаў, і ў Вырыцу ўехалі немцы на танках, самалёты скідвалі бомбы, і мы вырылі зямлянку на агародзе і падчас бамбёжак хаваліся там. У доме насупраць, дзе жыў чыноўнік, пасяліліся немцы, з гаспадарам хутка паразумеліся. Пасля ў яго працавалі некалькі чалавек нашых палонных салдат у якасці рабоў. Наша сям'я спрабавала дапамагчы палонным. Аднаго схавалі ў лазні. А нехта, магчыма, гаспадар дома, заўважыў, палоннага папярэдзілі мае родныя, і ён паспеў збегчы. Але данос на нашу сям'ю быў, і немцы вырашылі з намі расправіцца. У іх працавала перакладчыцай наша знаёмая, яна нас папярэдзіла, што нас расстраляюць. І мы ўсёй раднёй, з трыма малымі дзецьмі, сабраўшы тое-сёе з рэчаў, адправіліся агародамі ў шлях».* Наперадзе былі родная Беларусь, вогненная вёска, канцлагер і вызваленне... Раю такія гісторыі паспець занатаваць, паспець распытаць тых, хто памятае. Былі такія гісторыі і ў беларускіх пісьменнікаў, і часта яны ўвасабляліся ў старонкі твораў. Давайце разам пагартаем тыя старонкі і даведаемся, як пачалася вайна для нашых класікаў.

### Страшная ціша вёскі

Пенталогія Івана Шамякіна «Трывожнае шчасце» ў многім аўтабіяграфічная. Галоўны герой, Пеця, ажаніўся з аднакласніцай Сашай. Але калі Саша была цяжарная, Пецю забралі ў войска... Гэта рэальная гісторыя пра Шамякіна і ягоную жонку Марыю. Другі раман пенталогіі, «Начныя зарніцы», пачынаецца з таго, што Саша, вясковая фельчарка, нараджае дачушку. Яна і шчаслівая, і сумуе па сваім Пецю, які не можа тут прысутнічаць... Раптам да Сашы прыходзіць яе доктарка.

*«Марыя Сяргееўна села на табурэт побач з ложкам і пагладзіла Сашыны валасы. Але Саша не магла адвесці позірку ад яе твару: звычайна асветлены добрай усмешкай, ён быў нейкі ажно счарнелы, з запалымі вачыма, з непрыгожымі складкамі каля рота, быццам Марыя Сяргееўна пастарэла раптам на многа-многа гадоў.*

*— А што здарылася, Марыя Сяргееўна? — нясмела спытала Саша.*

*Рука ўрача пакінула гладзіць яе валасы і мацней прыціснулася да галавы.*

*— Няшчасце, Саша. Вялікае няшчасце.*

*— Для каго?*

*— Для ўсіх...*

*— Няшчасце для ўсіх? — не разумела Саша.*

*— Вайна, Саша, — Марыя Сяргееўна азірнулася: у палаце нікога не было, відаць, парадзіхі выйшлі гуляць.*

*Саша адчула, як страшэнна закалацілася яе сэрца, як закалола ў скроні і зноў раздануў боль у жываце. Словы ўрача пачалі далятаць як бы здалёк.*

*— Я выгнала карову... вярнулася да сябе, уключыла прыёмнік... Звычайна так рана станцыі маўчаць. А тут... што робіцца ў эфіры! Усе нямецкія станцыі... Уся Еўропа! Выступаў Гітлер... Яны бамбяць Кіеў... Кіеў! Гэта зусім блізка ад нас... Зусім... Вось тут... — Яна паказала рукой, і Саша паглядзела на акно, за якім шумеў ясны летні ранак, чуліся дзіцячыя галасы, сігналы машын, рыпелі фурманкі, і людзі мірна ехалі на рынак, яшчэ нічога не ведаючы. І на міг Сашы здалося, нібы ўсё, што яна пачула толькі што, — гэта працяг страшнага сну. А цяпер яна прачнулася і чуе зусім іншае».*

Зразумела, першая думка Сашы — як жа там Пеця, які служыць у Запаляр'і? Вестка даходзіць да вяскоўцаў, многія з якіх зараз пойдуць ваяваць... І тут з'яўляецца яркая мастацкая дэталь: насуперак Сашыным чаканням, у вёсцы вельмі ціха... Хоць нават звычайныя праводзіны ў армію заўсёды адбываліся шумна.

*«Яна не адразу зразумела, што робіць цішыню такой напружанай, страшнай. Толькі калі выйшла на вуліцу, тады зразумела: няма вясёлага гоману дзяцей. Звычайна ў такі ясны летні вечар усюды — на кожнай вуліцы, на выгане, каля сажалкі, на калгасным стадыёне — гуляюць дзеці, усюды іх смех, крыкі, гоман. У гэты ж вечар дзяцей нідзе не было, і ад гэтага рабілася жудасна; Саша адчула страшны подых вайны. Якое ж гэта вялікае гора, калі яго зразумелі, адчулі нават дзеці, самыя маленькія нават!»*

### З выпускным балем, дзяўчынкаю ў белым і вальсам да раніцы

Ва Уладзіміра Караткевіча таксама была своя гісторыя вайны... Падлеткам ён неаднойчы спрабаваў збегчы на фронт, потым цудам знайшоў згубленых бацькоў. Старэйшы брат загінуў на фронце... У рамане «Чорны замак Альшанскі» ў галоўнага героя, гісторыка Антона Космiча, шмат падабенства з аўтарам. Але «жыццяпіс гэтага старога кавалера» трохі адрозніваецца ад біяграфіі аўтара, цалкам магчыма, што ў ім ёсць нешта ад біяграфіі старэйшага брата Караткевіча.

*«На два гады раней, чым трэба, скончыў школу. Шчанюком з мокрым пыскам. У сорак першым. Напярэдадні. З выпускным балем, дзяўчынкаю ў белым і вальсам да раніцы. Дурны, збіты, зацяганы дрэннымі пісьменнікамі прыём. Але тут так і было. На жаль і тугу. Таму што той раніцай дзве першыя бомбы ўпалі на паштамт і кінатэатр. Мы з ёю былі ў кінатэатры, так што ўсё гэта здарылася на маіх вачах.*

*Трос перад ваенкомам пасведчанне аб заканчэнні школы. Пашпарта яшчэ не было. Але паверылі. Быў... здаровая, словам, вымахала доўбня. Узялі.*



*І сербануў я тут спаўна. Родны гарадок. Адступаем. Над паравым млынам адзіны ўцалелы рэпрадуктар, і з яго бравурны марш. І нараўнянін Каляда, камандзір майго аддзялення, увесь у пыльных бінтах, разануў па ім з аўтамата (мала іх яшчэ тады было, ледзь не адзінкі).*

*Разануў, «каб не звягаў, паразіт».*

*Тут і скончылася мая ўзнёслая маладосць».*

### «Што пад той, пад вярбой, салдат ранены...»

Героям аповесці Івана Сяркова «Мы з Санькам у тыле ворага» давялося сербануць спаўна ў ваеннае ліхалецце. Аўтар апісваў уласнае дзяцінства, жахі нямецкай акупацыі. А пра пачатак вайны малыя героі даведваюцца так... У іх хаце на куце пад абразамі стаяла невялікая ружовая скрынка — радыё. Хлопчык Іван з малодшым братам Глыжкам вырашылі паглядзець, як яно працуе... І зламалі. Бацька паклікаў майстра Бусліка, рамантаваць.

*«Паглядзеў Буслік спачатку на радыё, потым на нас з Глыжкам і па-змоўніцку падміргнуў. Затым ён пакалупаўся крыху ў дроціках, скрынка пашыпела, пакашляла, быццам у глотцы яе нешта перасела, і строгім незнаёмым голасам сказала: «Наше дело правое, враг будет разбит, победа будет за нами»*

*Бацька аж ускочыў з лаўкі.*

*— Што гэта?*

*— Здаецца, вайна, — няўпэўнена адказаў Буслік, потым згроб свае абцужкі, адвёрткі, шрубкі-болцікі і, махнуўшы рукой на бутэльку, якую бацька паставіў на стол, выбег з хаты.*

*Вайна. Бацька надзеў на галаву шапку і таксама ляпнуў дзвярыма.*

*Што такое вайна, я ведаю. Вайна — гэта калі бацьку прыносяць з сельсавета павестку, каб ён хуценька збіраўся ў нейкі там ваенкамат. Тут маці пачынае плакаць і збіраць торбу. Бабуля таксама ходзіць па хаце з кута ў кут і гаворыць, што якой толькі пошасці на чалавека не прыдумаюць. І ў мяне шкрабаюць на душы кошкі, але я трымаюся, стараюся, каб не заплакаць. Я мужчына».*

Бацька Івана ўжо быў на вайне — калі вызвалялі Заходнюю Беларусь... Цяпер ён зноў збіраецца на фронт. На праводзіны прыйшлі вяскоўцы, размовы невясёлыя...

*«— Давайце мы лепш спяём, — перабіла мужчынскія размовы цётка і, не чакаючы згоды, зацягнула высокім, прарэзлівым голасам.*

*У нас з Санькам аж у вушах зазвінела.*

*Ой, паля вы, паля,*
*Вы зялёны паля.*

*Мужчыны набралі духу і ляніва загулі басамі:*

*А чаму ж на вас, паля,*
*Ураджаю няма?..*

*— Трэба вышэй, — параіў Скок і пачаў дапамагаць цётцы:*

*А чаму ж на вас, паля,*
*Ураджаю няма?..*

*Ад натугі ў суседа выступілі на шыі жылы і пачырванеў твар. Здавалася, вось-вось у яго горле лопне нейкая струна і ўсё скончыцца. Але струна не лопаецца, і тонкі, чысты голас плавае над басамі:*

*Толькі вырасла адна*
*Кучаравая вярба-а-а!*

*— Вось, мой татка, як спяваюць, — пахваліўся Скок і зноў зацягнуў. Спяваючы, ён закідвае галаву ўгару, быццам певень п'е ваду.*

*Што пад той, пад вярбой,*
*Салдат ранены...*

*Яго падтрымала цётка:*

*Ў галавах у яго*
*Вараны конь стаіць.*

*Тут маці, якая да гэтага ўсё набівалася гасцям, каб яны паспыталі то бліноў, то студзіны, моўчкі паднялася з-за стала і, закрываючыся ад людзей хусткай, выйшла ў сенцы. Басы змоўклі. Толькі высокі голас суседа ўсё не хацеў сціхаць:*

*На грудзях у яго...*

*І раптам голас абарваўся. Апошнія словы Скок не праспяваў, а, уздыхнуўшы, прагаварыў:*

*Сцяг чырвоны ляжыць...*

*Настала цяжкая цішыня, толькі муха дзінькала ў акне, б'ючыся аб шыбу».*

### «Але ўжо агульны цяжар лёг на плечы кожнага»

Раман Алеся Адамовіча «Вайна пад стрэхамі» таксама мае аўтабіяграфічны характар. Галоўны герой, хлопчык Толя, сын загадчыка сельскай бальніцы і аптэкаркі, — гэта і ёсць Алесь Адамовіч. У раздзеле «Вайна ўваходзіць у дом» апісана раніца 22 чэрвеня 1941 года, калі *«Людзі ў пасёлку не ведалі, што ўсё тое, пра што яны думалі і клапаціліся, чаму радаваліся і аб чым бедавалі ў гэтую чыстую чэрвеньскую раніцу, было зусім не такім важным, як ім здавалася: ужо некалькі гадзін ішла вайна».*

У гэты час чатырнаццацігадовы Толік Корзун едзе ў прапылёнай паўтаратонцы — вяртаецца дадому з гасцявання ў дзядзькі. Ён шчаслівы, усім усміхаецца... Вось і родная хата... Маці... Але яе голас гучыць не так, як звычайна.

*«— Вайна, сынок. З немчынай.*

*Нешта засмактала ўнутры, так бывае, калі арэлі ляцяць уніз. Вайна! Учора яшчэ такое незаўважнае сярод іншых слоў, звернутае ў кніжнае мінулае і няпэўна далёкую будучыню, слова гэтае раптам злавесна ажыло, яно ўстала, як плаціна, упоперак усіх думак, жаданняў, пачуццяў. Не ведаючы, што і як сказаць маці, бледнай і заплаканай (ён толькі цяпер убачыў гэта), сын пастараўся зрабіць сур'ёзны і нават спалоханы твар і паспяшаўся сысці да мужчын».*

Бацька Толі з'ехаў на аэрадром... А людзі сабраліся каля слупа з радыём, слухалі, *«і такое было адчуванне, што кожны стаіць і прыгнечана цяміць: што страціў ён сёння, што недарабіў, не пабачыў, не паспеў? Яшчэ нікога з тых, што стаялі тут, пад прышашэйнымі хвоямі, вайна не закранула, але ўжо агульны цяжар лёг на плечы кожнага. Апоўдні, а гэта толькі першае паведамленне аб вайне, распачатай у тры гадзіны ночы. Не мы на тэрыторыі ворага, а ён на нашай, ягоныя самалёты над нашымі гарадамі. Гэта бянтэжыць, але не палохае. Людзі ўсё ж не разумеюць немца: што прымусіла яго кінуцца на сцяну, загадзя нязломную? Вось-вось павінна быць паведамленне, што нечаканы наскок ворага адбіты. Што такое паведамленне будзе, верыць амаль усе, яго прагна чакае, хоча пачуць і той, хто заўтра кінецца на ўсход з дзецьмі на руках, і той, хто сустрэне ворага на парозе сваёй хаты з непераходзячай нянавісцю, і нават сёй-той з тых, хто хутка пачне падлічваць свае крыўды ці хто праз нейкі месяц павяжа на рукаў белую анучу паліцая».*

### Што распавялі дзіцячыя цацкі

Паэма Аркадзя Куляшова «Сцяг брыгады» напісаная ў выглядзе паэтычнага дзённіка. Яе пачатак адлюстроўвае тое, што перажыў сам паэт. Дачка Валянціна ўспамінала: *«24 чэрвеня Мінск перажыў жудасную бамбардзіроўку, і бацька разам са знаёмым журналістам і выкладчыкам пад бомбамі шукаў ваенкамат, каб запісацца на фронт. У Калодзішчах на армейскім пляцы толькі чырвоныя пятліцы нагадвалі пра тое, што тут была армія — усе сталічныя ваенкаматы ўжо выехалі. Убачыўшы гэта, бацька страціў прытомнасць. Гэта быў яго першы інфаркт. Сябры па няшчасці неслі яго барысаўскімі балотамі тры дні. Урэшце Куляшоў устаў на ногі, і яны дабраліся да Оршы, дзе яшчэ дзейнічаў прызыўны пункт».*

У паэме прыводзяцца кранальныя падрабязнасці адыходу з Мінска.

*«Як ад роднай галінкі*
*дубовы лісток адарваны,*
*Родны Мінск я пакінуў,*
*нямецкай бамбёжкаю гнаны.*
*Міма дрэў, міма дрэў*
*Усю ноч я ішоў, — за спіною*
*Родны горад гарэў,*
*І не ведала сэрца спакою.*
*Я здарожыўся, сеў*
*каля хатак чакаючы сонейка*
*У блакнот свой*
*заношу пачатак*
*Вандроўнага дзённіка...*
*Што сказалі мне рэчы,*
*Калі я выходзіў з кватэры?*
*Рэчы хатнія ўсе*
*Аглядаў я з маўклівай тугою,*
*Бо прасілі мяне па чарзе,*
*Каб забраў іх з сабою.*
*А ні лыжкі, ні міскі*
*Застацца ў кватэры*
*не хочуць,*
*Не згаджаюцца кніжкі,*
*Каб вораг паліў іх на плошчы.*
*Конь майстэрскай работы,*
*З кардону, на колах*
*драўняных,*
*Мне сказаў: — На каго ты*
*Пакідаеш нас, занядбаных?*
*Забяры, гаспадар, бо я тут*
*Усё роўна загіну...*
*Хіба я не вазіў з кута ў кут,*
*З кута ў кут твайго сына?*
*Як вайна пачалася, ты быў,*
*гаспадар, на раёне,*
*І адтуль да сям'і ў родны*
*горад прыехаў ты сёння.*
*Гаспадыня ж учора*
*З малымі пайшла да вакзала,*
*А мяне яна з гора*
*На поезд з сабою не ўзяла.*
*Не хацеў адпусціць*
*мяне сын,*
*Пакідаючы хату,*
*Не згаджайся,*
*каб жыў я адзін,*
*Каб я жыў без дагляду».*

Так, дзень 22 чэрвеня ў кожнай сям'і застаўся звязаны з трагічнымі ўспамінамі... Галоўнае — каб памяць пра гэта перадавалася далей. А творы беларускіх пісьменнікаў дапамогуць у гэтым.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**





Галіна Цімчанка.
Фота 2009 года.




# НА БАБІНАВІЦКІХ ВЫШЫНЯХ

*(Пачатак на 1-й стр.)*

У Бабінавіцкіх ваколіцах фронт стаяў цэлых дзевяць месяцаў — з лістапада 1943-га да чэрвеня 1944-га. Адсюль, з вышынь і балот, пачыналася вызваленча-наступальная аперацыя «Баграціён». Некалькі разоў Чырвоная Армія спрабавала прарваць абарону гітлераўцаў, але не ўсе атакі мелі станоўчы вынік. У адной такой аперацыі каля вёскі Асіпенкі трыццаць восем байцоў мінамётнага палка авалодалі вышынёй і на працягу некалькіх дзён адбівалі варожыя атакі супраць 800 нямецкіх пехацінцаў, адбілі іх чатыры атакі, знішчылі болей як 250 гітлераўцаў. А паколькі сувязі з армейскім камандаваннем не было, ніхто не ведаў, ці жывыя мінамётчыкі. І таму спачатку залічылі іх у спісы тых, хто прапаў без вестак. Пра гэты ваенны эпізод пісалі многія франтавыя газеты. Пасля вайны, у 1959 годзе, адна з такіх газет трапіла на вочы настаўніцы гісторыі і геаграфіі Бабінавіцкай школы Галіне Цімчанцы. І яна з вучнямі занялася пошукам відавочцаў тых баёў. Перапіска з франтавікамі і камандзірам той батарэі Леанідам Ціхмянавым і камсоргам Сяргеем Багамолавым дала плён і кірунак для далейшага пошуку. А потым узнік і народны школьны музей, а на безыменнай вышыні пад Асіпенкамі ўзвялі курган і назвалі яго ў гонар камандзіра — Ціхмянаўская вышыня. Галіна Аляксандраўна Цімчанка на працягу 40 гадоў кіравала музеем, і дзякуючы ёй воінскае пахаванне ў Бабінавічах таксама ператварылася ў галоўны мемарыял раёна. У гэтым ёй дапамагала настаўніца пачатковых класаў Дзіна Багдановіч. Калі першы кіраўнік музея па стане здароўя не змагла спраўляцца, музейна-пошукавую справу стала працягваць Дзіна.






У 2018 годзе Галіны Цімчанкі не стала, але жыхары вёсак Бабінавічы і Асіпенкі не забылі сваю настаўніцу, ахвяравалі грошы, каб каля падножжа воінскага пахавання ўсталяваць памятную дошку з партрэтам заслужанай зямлячкі. На гэтым прыкладзе павагі і памяці вяскоўцы прадэманстравалі нераўнадушша да гісторыі свайго народа, да людзей, якія абаранялі Радзіму, і тых, хто шукаў праўду і захоўваў яе для іншых пакаленняў. У 2009 годзе і мне давялося сустракацца з мужнай і працавітай музейшчыцай, і ў «Звяздзе» з'явіўся яе фотапартрэт. А былы школьны музей з-за таго, што школу закрылі, пераехаў у будынак сельскага выканаўчага камітэта. Дзіна Анатольеўна па-ранейшаму вядзе пошукавую працу, піша ў архівы лісты, перапісваецца з роднымі і нашчадкамі герояў, збірае артэфакты, якія маюць самае непасрэднае дачыненне да вайны на бабінавіцкай зямлі. За зберажэнне і папулярызацыю гістарычнай і культурнай спадчыны і асабісты ўклад ва ўвекавечванне памяці аб загінулых і ў гонар 75-годдзя вызвалення Беларусі Дзіне Багдановіч была ўручана дзяржаўная ўзнагарода.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

**Больш здымкаў глядзіце на сайце «Звязды».**





## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир» (продавец) извещает о проведении 4 июля 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС, бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Местонахождение лотов:** г. Гомель, ул. Войсковая,16 | | | |
| 1 | **Грузовой бортовой тентовый GAZ 3309 KI 4738 CUPAVA**, **рег. № АА 5518-3**, год выпуска – не определен, номер кузова (рамы) Y3H47380060038153, цвет – белый, состояние – удовлетворительное, пробег – 518 150 км | 4 345,00 | 217,25 |
| 2 | **Грузовой бортовой тентовый MAZ 437143 332**, **рег. № AI 0666-3**, 2011 года выпуска, номер кузова (рамы) Y3M437143B0000921, цвет – белый, состояние – удовлетворительное, пробег – 474 176 км | **6 050,00** | 302,50 |
| 3 | **Полуприцеп цистерна CLAYTON CLAYTON**, рег. № А 9531 В3, 1997 года выпуска, номер кузова (рамы) 9724521, цвет – серебристо-синий, состояние – удовлетворительное, пробег – 363 050 км | **49 900,00** | 2 495,00 |
| 4 | **Трактор колесный МТЗ-80**, рег. № ЕВ-3 9154, 1992 года выпуска, зав. номер 861379, состояние – удовлетворительное. **Местонахождение:** г. Гомель, ул. Войсковая,16 | **9 064,00** | 453,20 |

